Новы Час | 29 лістапада 2019 | № 44 (655) | «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | №11

Літаратурная Беларусь

Выпуск №11 (159)
(лістапад)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas.by

Змест

ЕЎРАПОГЛЯД: права на ганарар і досвед Еўрапейскага Саюза .... с. 2
ПАМЯЦЬ: развагі Ірыны САМАТОЙ з нагоды 80-годдзя з дня нараджэння Анатоля КАНАПЕЛЬКІ .... с. 3
ПРОЗА: апавяданне Алеся БЫЧКОЎСКАГА «Спадкапрыемца» .... с. 4
ПАЭЗІЯ: вершаваныя нізкі Васіля БАРЫСЮКА і Валянціны ОСІПАВАЙ .... с. 5
ШКАЛЯРЫЙ: чарговыя апавяданні з будучай кнігі Уладзіміра АРЛОВА і Паўла ТАТАРНІКАВА «Айчына: маляўнічая гісторыя» .... с. 6–7
ФОРУМ: вершы Адама ГЛОБУСА і «Афарызмы» Эдуарда ДУБЯНЕЦКАГА .... с. 8
ЭСЭ: роздум Уладзіміра МАРОЗА «Развітанне з мяжой» і «Усё таемнае...» Альжбеты КЕДА .... с. 9–10
ДРУК: агляд ЛеГала новага нумара часопіса «ДЗЕЯСЛОЎ» — «І хай ніхто не пойдзе пакрыўджаным» .... с. 11
СВЕТ: навіны замежнага літаратурнага жыцця .... с. 12

Бэтмэн супраць Быкава: масавае і элітарнае

Людміла СІНЬКОВА

Мы жывем у часы, калі лёгкае чытво ў крамах усяго свету актыўна выцясняе з кніжных паліц элітарную літаратуру.

Беларусь тут не выключэнне. Варта, напрыклад, зайсці ў Цэнтральную кнігарню Мінска на праспекце Незалежнасці і паглядзець, што за кнігі гартаюць патэнцыяльныя пакупнікі. Мы адразу ўпэўнімся, што большасць цікавіцца ўзорамі так званай масавай літаратуры. Пра гэты факт варта задумацца спецыяльна.

Што такое масавая літаратура?

Масавымі лічацца кнігі, у якіх пра што заўгодна расказваецца элементарна, «на пальцах»: гэта папулярныя думкі ў папулярных формах, гэта «простыя словы, простыя рэчы» для «простага» чытача.

Вось тут і трэба агаварыцца. Ёсць рознае «простае». Ёсць, безумоўна, зусім прымітыўнае, белымі ніткамі шытае.

Але ў большасці выпадкаў гаворка пра іншае. Калі дасціпныя Міхал Анемпадыстаў і Лявон Вольскі (аўтары песні са знакамітым слоганам пра простыя словы і простыя рэчы) маюць на ўвазе «хлеб на стале і полымя ў печы», дом, сям'ю, наш беларускі свет, то мы разумеем: насамрэч гэта зусім не элементарна — пабудаваць свой дом, вырасціць сына, зладзіць агмень. І мы адчуваем усмешку аўтараў, перажываем эйфарыю, слухаючы Вольскага: як гэта здорава, што творцы змаглі перафарматаваць у папулярны слоган нашы сакральныя сэнсы.

Аналагічна: чытаючы Быкава, ніхто не думае, што «У тумане» — гэта толькі дэтэктыў. Любому ясна, што тут форма дэтэктыва абслугоўвае Быкава, а не наадварот (і ў фільме Сяргея Лазніцы 2012 года па Быкаву, трыумфатары 65-га Канскага фестывалю, той жа дэтэктыў абслужыў арт-хаус). Банальны прыклад такога ж кшталту — амаль увесь Дастаеўскі.

І наадварот: кароткі слоган на тэму «Нигде, кроме / как в Моссельпроме» (нават калі яго аўтар — сам Маякоўскі) — гэта ўсяго толькі масавая рэклама. А дэтэктыў, у якім няма нічога звыш таго, што нехта некага забіў, у кагосьці штосьці скраў ці падмануў чужую жонку — гэта толькі масавае чытво: разгадванне крыжаванкі, скакалка для мазгоў, вінпацэцін.

Чаму літаратура для мас такая папулярная ва ўсім свеце?

Вядома, у іншых народаў таксама ёсць свая міфалогія, казкі, літаратура і культура — але няма такіх тэхналагічных і фінансавых магчымасцяў, каб трансляваць уласнае светабачанне ўсім і кожнаму, хто ахвочы спажываць прафесійна прыгатаванае і ўпакаванае.

Але, можа быць, нават больш важная за эканоміку тут псіхалогія: масавая літаратура актыўна і наўпрост звяртаецца да нашага ўнутранага жыцця — да нашых патаемных жаданняў, мар, нашай фантазіі, уяўленняў пра будучыню, нашай прагі незвычайных прыгод і асалод, яскравых эмоцый... Не толькі да свядомага, але і да падсвядомага, да інстынктаў, страхаў і комплексаў. Фрэйд з яго тэзісамі пра сублімацыю ў XXI стагоддзі аказаўся суперактуальным.

І калі чалавек не хоча засмучаць сябе надзвычай траўматычнай праўдай пра рэальныя войны і чарнобылі, сацыяльны гвалт і абсурд, то відовішчы гвалту ў трылерах, дзе брутальнага героя лупяць жалезным прэнтам па галаве, а ён пасля гэтага ўсіх лупіць двума прэнтамі, якраз глядзіцца ледзь не з катарсісам.

Ці вінаватыя людзі ў тым, што любяць масавую літаратуру?

У любові, кажуць, ніхто не вінаваты. Сярэднестатыстычны чытач вінаваты хіба ў тым, што ён лэйзі — гультай. Ён хоча толькі пасіўна спажываць, стоячы ля прыгожай вітрыны, інфантыльна ідучы за мерчандайзерам (тавараведам-рэкламшчыкам), не даючы сабе працы задумацца, што можна шукаць у кніжнай краме...



Фота www.spectator.co.uk

Ён падатлівы, ён гатовы саступіць: нашто чытаць «У тумане» (экзістэнцыйную драму), калі можна — Марыніну (мікс дэтэктыва з жаночай прозай)? Нашто глядзець яшчэ і нізкабюджэтны «Салярыс» (філасофскую прытчу), калі можна — толькі найвысокабюджэтны «Аватар» (казку-фэнтэзі)?

Але чытацкая падатлівасць — якасць перспектыўная, яна дазваляе чытачу расці. Асабліва, калі рост пачынаецца ў юнацкія гады і з такіх выдатных аўтараў, як Эдгар По і Уладзімір Караткевіч, Агата Крысці і Людміла Рублеўская, Баляслаў Прус і Уладзімір Арлоў... Такое чытанне выхоўвае густ і вучыць выбіраць!

Чаму мы аднойчы ўсё ж абавязкова выбіраем класіку?

Чаму аднойчы абавязкова запальваем свечку? Таму што ў душы кожны ведае, што ёсць на свеце рэчы вялікія, абсалютныя, светланосныя, пра якія гавораць нам Слова. Слова — гэта Бог (так запісана Янам Багасловам). Ніякі рэнтген не можа выявіць у чалавечым целе душу. Гэта можа толькі слова. І калі мы захочам адчуць трывалае апірышча для сваёй душы ў нейкую змрочную часіну, або прыгадаць некалі перажытую асалоду ад гармоніі і хараства, досціпу, якія заўсёды можна знайсці ў слове, мы адкрываем сур'ёзныя кнігі.

Чаму Бэтмэн ніколі не пераможа Быкава?

Калі запытацца ў мінака на вуліцы пра яго любімыя кнігі, то чалавек, калі ён не жартуе, памкнецца ўсё ж назваць і нешта аўтарытэтнае. Сярод значных для сябе ён назаве і тыя творы, што замацаваны грамадствам у высокім аксіялагічным рэгістры. Інстынктыўна кожны адчувае: кругагляд сучаснага чалавека не павінен быць абмежаваны толькі нейкім культурным фаст-фудам.

Ды і яшчэ адно тлумачэнне такому выбару ёсць.

Літаратура для мас ніколі не пераможа класіку, не зможа заняць яе месца найперш таму, што кожнаму чалавеку наканавана расці і сталець.

Няхай сабе многія школьнікі з Пушкіна найтрывалей запамінаюць фразу «выпьем с горя; где же кружка? / Сердцу будет веселей», а выраз «и мальчики кровавые в глазах» звязваюць выключна з якімі-небудзь разборкамі. Аднак гэта ж не азначае, што трэба выкінуць са школьнай праграмы пушкінскага «Барыса Гадунова» на карысць якой-небудзь «Гаўрыіліяды» або пакінуць толькі верш «Зімні вечар».

Калі з «Палескай хронікі» вучні найлепш запамінаюць гісторыю кахання Васіля, Ганны і Яўхіма, то гэта яшчэ не значыць, што настаўнік павінен трактаваць Мележа як «Богатые тоже плачут», каб навучыць падлеткаў любові да беларускай літаратуры і культуры, развіць інтэлект.

Няхай у купалаўскай страфе — «Сярод раз'юшаных сатрапаў / Крывавы зладзіўшы хаўрус, / Свае таргуюць і чужыя / Табой, няшчасны беларус» — хтосьці напачатку будзе разумець толькі адно словазлучэнне: «няшчасны беларус»... няхай напачатку з кімсьці будзе менавіта так.

Але ж усе школьнікі абавязкова вырастуць. І важна, каб будучыя дарослыя з гэтай страфой, з цэлай Атлантыдай літаратурнай класікі і захаванай у ёй культуры проста не размінуліся. Тады ў іх застанецца шанс яшчэ з ёю сустрэцца, многае зразумець.

Бо ў дарослым жыцці менавіта сур'ёзнае, культурай напоўненае слова дае сэнс, апірышча, арыенціры для быцця ў гэтым свеце. Такую функцыю пісьменства для рэлаксу (таксама ж патрэбнае!) выконваць не здатнае. Яно, як правіла, якраз дэзарыентуе — на карысць таго, хто «трымае бізнес».

Калі ж чытач хоча ўсё жыццё заставацца інфантыльным, выключна звяном у «харчовым» ланцужку, то гэта яго асабістая праблема. Класічная літаратура тут ні пры чым. А вось інтэлігенцыя — «пры чым»: сцвярджаць сапраўды вартае належыць у першую чаргу ёй.

Права на ганарар

Алена НЯПАЛЬСКАЯ

PLR (Public Lending Right) — кароткая абрэвіятура, вядомая кожнаму пісьменніку ў краінах Еўрапейскага Саюза. Яе можна перакласці так: права на ганарар аўтарам за бясплатнае выкарыстанне іх матэрыялаў/твораў у публічных установах.



Дзейнічае права наступным чынам: чытач прыходзіць у бібліятэку, замаўляе кнігу, а дзяржава выплачвае пісьменніку-аўтару за гэта грошы. Выплаты залежаць ад таго, як часта бралі кнігу. Для аўтара ў любой краіне свету рэалізацыя гэтага права вельмі важнае, паколькі дазваляе атрымліваць фінансавую дапамогу для далейшай творчасці.

Права на ганарар за кнігі, што знаходзяцца ў публічным бясплатным карыстанні, не ўзнікла само па сабе — гэта вынік доўгага працэсу, і канешне ж, барацьбы аўтараў за свае правы. Так, Марын Дафі, пісьменніца, якая цягам 20 гадоў змагалася за гэтае права ў Брытаніі (яно было прынятае ў 1979 годзе), характарызуе PLR наступным чынам: «У першую чаргу PLR падтрымлівае прынцып «няма карыстання без аплаты», што ляжыць у аснове канцэпцыі «справядлівай ці заслужанай узнагароды», якая ў сваю чаргу распаўсюджваецца на ксеракапіраванне і лічбавы распаўсюд. Гэтая канцэпцыя абапіраецца на Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека, згодна з ёю мы маем права атрымліваць прыбытак ад любой эксплуатацыі нашай працы. Калі сцвярджаецца, што гэта перашкаджае іншаму агульначалавечаму праву — доступу да ведаў да культуры — наш адказ просты: дзеянне гэтага прынцыпу дазваляе нам ствараць новыя кнігі. Мы ж не патрабуем ад настаўнікаў працаваць дарма».

У цяперашні час PLR-сістэма дзейнічае ў 33 краінах свету. Права на ганарар за творы, што знаходзяцца ў публічным карыстанні, прызнанае заканадаўствам Еўрапейскага Саюза з 1992 года, і ўсе, акрамя чатырох краін, якія маюць сістэмы PLR, знаходзяцца ў Еўропе.

Данія была першай краінай, якая ўсталявала сістэму PLR у 1946 годзе, затым былі Нарвегія (1947 год) і Швецыя (1954 год). А сама ідэя «Права на ганарар за творы ў публічным бясплатным карыстанні» ўзнікла ў 1919-ым, калі Асацыяцыя паўночных аўтараў прыняла пастанову, у якой заклікала ўрады кампенсаваць аўтарам, кнігі якіх знаходзяцца ў бібліятэках, карыстанне імі.

Новая Зеландыя была першай краінай за межамі Еўропы, якая ўстанавіла сістэму PLR у 1973 годзе, за ёй — Аўстралія (1974 год), Канада ды Ізраіль (1986 год).

Каля 26 іншых краін прызнаюць законнае права аўтараў ліцэнзаваць карыстанне сваімі творамі, але ў гэтых краінах яшчэ не створаны сістэмы кампенсацыі. Апошняя краіна, дзе пачала працаваць гэтая сістэма — наша суседка Польшча. У ёй у 2016 годзе былі зроблены першыя выплаты аўтарам за карыстанне іх кнігамі ў публічных бібліятэках.

Прававая аснова PLR

Такім чынам, большасць сістэм PLR існуе ў Еўропе, дзе краіны-чальцы Еўрапейскага Саюза абавязаны надаваць аўтарам эксклюзіўнае права дазваляць альбо забараняць выдачу іх твораў бібліятэкамі. Аднак урады гэтых краін могуць адступіць ад гэтага права пры ўмове, што яны ўзнагароджваюць аўтараў за «пазыку» іх твораў.

Права на ўзнагароду-ганарар не з'яўляецца абавязковым патрабаваннем закона аб Аўтарскім праве, і ўрады па-за Еўрапейскім Саюзам не абавязаны ствараць падобныя сістэмы. Напрыклад, у Афрыцы, Паўднёвай Амерыцы і Азіі няма сістэм PLR. Адзіныя краіны па-за Еўропай, якія цяпер працуюць з гэтым правам — Аўстралія, Канада, Ізраіль і Новая Зеландыя.

Але ўсё мяняецца… Рэспубліка Малаві і Грэцыя нядаўна ўвялі заканадаўства аб PLR і рыхтуюцца стварыць адпаведныя сістэмы; урад Ганконга таксама пагадзіўся ўвесці PLR; праект закона аб аўтарскіх правах, які прадугледжвае PLR, неўзабаве будзе разглядаць парламент Турцыі.

І — яшчэ пра карысць PLR. Гэтая сістэма таксама можа функцыянаваць як частка структуры падтрымкі дзяржававай яе ўласнай культуры і мовы. У шэрагу еўрапейскіх краін, такіх, як Данія, Нарвегія і Швецыя, PLR выплачваецца толькі аўтарам, якія пішуць на нацыянальнай мове краіны. Сістэмы PLR у Аўстраліі і Канадзе падтрымліваюць аўтараў, якія з'яўляюцца грамадзянамі гэтых краін.

Як функцыянуе PLR

Фінансава за рэалізацыю Права на ганарар аўтару адказваюць не бібліятэкі (са сваіх фондаў), а рэгіянальныя альбо цэнтральныя ўрады. Ёсць нешматлікія выпадкі, калі грошы паступаюць ад бібліятэк — да прыкладу, у Нідэрландах, бо там публічныя бібліятэкі працуюць як незалежныя інстытуцыі, і PLR разглядаецца бібліятэчнай супольнасцю як законная плата, якая справядліва кампенсуе аўтарам бясплатнае выкарыстанне чытачамі іх твораў.

Розныя падыходы да выплат PLR

Часцей за ўсё ўзнагароджанне, звязанае з PLR, размяркоўваецца паміж аўтарамі ў выглядзе выплат, звязаных з тым, як часта іх творы знаходзіліся ў карыстанні чытачымі. Такі падыход ажыццяўляецца ў Фінляндыі, Германіі, Мальце, Нідэрландах і Вялікабрытаніі.

Альтэрнатыўны падыход — аплата залежыць ад колькасці кніг/твораў аўтара, якія захоўваюцца ў бібліятэках. Такая сістэма існуе ў Аўстраліі, Канадзе і Даніі.

Іншыя варыянты ўключаюць у сябе плацяжы пры набыцці кніг. Як, да прыкладу, у Францыі, дзе частка агульнага фонду выплат ідзе ад выдаўцоў, калі яны прадаюць кнігу ў бібліятэку. Астатняя частка фонду PLR складаецца з невялікіх выплат, якія ажыццяўляе ўрад за кожнага зарэгістраванага карыстальніка бібліятэкі.

Шмат краін спалучае элементы названых розных падыходаў.

Хто атрымлівае выплаты PLR

У стварэнні кнігі ўдзельнічаюць не толькі пісьменнікі, але і іншыя асобы: ілюстратары, перакладчыкі, рэдактары і фатографы (якія ў розных юрыдычных сістэмах могуць таксама лічыцца аўтарамі). Паколькі яны ўносяць свой уклад у апублікаванне твора, то могуць прэтэндаваць і на выплату PLR.

Цяпер Права на атрыманне ганарару за публічнае карыстанне творамі распаўсюджваецца як на друкаваныя кнігі, так і на розныя аўдыявізуальныя матэрыялы, у тым ліку аўдыякнігі, якія знаходзяцца ў бібліятэках. Тады права на аплату маюць і кампазітары, і прадзюсары, і акторы, якія начытвалі тэксты.

Што да электронных кніг, то іх выкарыстанне таксама рэгулюецца законам, бо з кожным годам расце рынак іх спажывання. Пасля рашэння Еўрапейскага Суда ў 2016 годзе (справа C-174/15), Дырэктыва аб праве на публічнае карыстанне вызначае, што аб'ектам выплаты лічыцца пазыка адной электроннай кнігі ў бібліятэцы адным карыстальнікам. Копія можа быць зноў перададзена ў арэнду, але толькі калі электронная кніга ўжо не будзе даступная папярэдняму пазычальніку.

Чаму PLR важна для аўтараў

Таму, што гэтыя выплаты рэальна змяняюць жыццё аўтараў. У эпоху, калі даходы творцаў ад публікацый паўсюдна пáдаюць, дзеянне PLR дапамагае аказваць аўтарам жыццёва важную фінансавую падтрымку. Напрыклад, у Вялікабрытаніі 24 тысячы пісьменнікаў, ілюстратараў і перакладчыкаў атрымліваюць плацяжы ў памеры да 6600 фунтаў стэрлінгаў (амаль 10000 даляраў) штогод. Для многіх пісьменнікаў, асабліва тых, хто не ўваходзіць у лік «бэстсэлерных», гэта істотная крыніца даходу.

Морын Дафі, аўтарка навукова-папулярнай літаратуры і навэл, адзначае, што сістэма PLR (прынцып «няма карыстання без плацяжу») можа быць выратавальніцай і для паспяховых пісьменнікаў, і для тых, хто ўжо не піша, але мае шмат апублікаваных твораў, якія застаюцца даступнымі для чытачоў публічных бібліятэк, хаця творы ўжо не друкуюцца наноў.

У дадатак да выплат аўтарам за карыстанне іх творамі ў публічных бібліятэках, фінансаванне PLR можа выплачвацца таксама ў выглядзе грантаў, якія вылучаюцца на даследаванні і падарожжы, альбо ў форме пенсій пісьменнікам. У некаторых краінах яго таксама можна завяшчаць пасля смерці аўтара яго сям'і да 70 гадоў.

Выплаты ганарараў аўтарам за права карыстацца бясплатна іх кнігамі можа датычыць не толькі публічных бібліятэк, але, як у Аўстраліі, яшчэ і школьных, што вельмі падтрымліваецца дзіцячымі пісьменнікамі. А ў Германіі такая сістэма дзейнічае і ў бібліятэках вышэйшых навучальных устаноў.

Сістэма PLR стварае і іншыя перавагі для аўтараў. Напрыклад, аўтары Вялікабрытаніі лічаць, што дадзеныя, атрыманыя ў офісе PLR пра тое, як часта іх кнігі былі запазычаныя ў публічных бібліятэках, натхняюць іх і паляпшаюць маральны стан — асабліва калі гаворка ідзе пра кнігі, якіх ужо болей няма ў крамах. «PLR — гэта больш, чым грошы, хаця, вядома, апошнія таксама някепска. Атрыманне грашовага чэка штогод — гэта напамін пра тое, што людзі хочуць чытаць мае кнігі, а не проста мець іх», — адзначыла амерыканская пісьменніца Трэйсі Шэвалье, аўтарка вядомага рамана «Дзяўчына з жамчужнай завушніцай».

КНІГАРНЯ

Апошні першы снег

Вера Лойка. Апошні першы снег: апавяданні, эсэ. — Мінск: Кнігазбор, 2019. — 112 с. (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»; выпуск 119).

«Апошні першы снег» — дэбютная кніга, тэксты якой пісаліся цягам дваццаці гадоў. Апавяданні вытрыманыя ў традыцыйна-класічным стылі і строга адпаведныя яму па сваёй літаратурнай форме. Узаемаадносіны паміж людзьмі ў постсавецкім грамадстве, іх думкі, пачуцці і ўчынкі, якія фармуюць філасофію жыцця беларускага этнасу — галоўная ідэйная скіраванасць твораў пісьменніцы. Артыкулы і эсэ, што складаюць другую частку выдання, распавядаюць пра жыццё вядомых людзей нацыянальнай і сусветнай літаратур (А. Васілевіч, А. Асташонак, С. Унсет), а таксама пра мастацкую творчасць, цесна звязаную з навакольным светам і жывой прыродай.

Беларуская «звышлітаратура»

Л. Д. Сінькова. Беларуская «звышлітаратура»: літаратуразнаўчыя і літаратурна-крытычныя артыкулы. Мінск. Кнігазбор, 2019. — 224 с. (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»; выпуск 120).

Кніга доктара філалагічных навук, прафесара Людмілы Дзмітрыеўны Сіньковай прысвечана літаратурнаму працэсу познесавецкіх і паслясавецкіх часоў у Беларусі. Разглядаюцца праблемы суадносін масавай і элітарнай літаратуры, фактаў з мастацкім вымыслам у прозе, метадалогіі сучасных літаратуразнаўчых даследаванняў, сучаснай літаратуры на беларуска-польскім памежжы. Аналізуюцца творы В. Быкава, А. Адамовіча, С. Алексіевіч, а таксама іншых пісьменнікаў і даследчыкаў прыгожага пісьменства.

«У слове нараджаецца паэт...»

Да 80-годдзя з дня нараджэння Анатоля Канапелькі

Ірына САМАТОЙ

У 60-х гадах XX стагоддзя ў беларускую літаратуру прыйшло так званае філалагічнае пакаленне, дзеці вайны, магутная кагорта пісьменнікаў, творчасць якіх характарызавалася маральна-этычнай змястоўнасцю, патрыятычным пафасам, аптымізмам духоўнага і сацыяльнага абнаўлення жыцця. Сярод творчых індывідуальнасцей гэтага часу сваёй адметнасцю і непаўторнасцю вылучаецца постаць віцебскага паэта, перакладчыка, літаратуразнаўцы, лаўрэата абласной літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Караткевіча, педагога, які, на жаль, рана і нечакана пайшоў з жыцця, Анатоля Канапелькі. Паэзія Анатоля Канапелькі — лірычная споведзь чалавека, які па-філасофску імкнецца асэнсаваць гістарычныя падзеі і з'явы з пазіцыі сучаснасці, праз гранічнае эмацыянальнае напружанне выявіць і сумясціць грамадзянскае і асабістае, высокае і будзённае.

Характар творчасці пісьменніка, як вядома, абумоўліваецца яго біяграфіяй. Нарадзіўся Анатоль Канапелька 16 лістапада 1939 года ў мястэчку Расоны Віцебскай вобласці ў сям'і служачага. З першых дзён вайны бацькі знаходзіліся ў партызанскім атрадзе, які дзейнічаў на тэрыторыі Мінскай вобласці. Ён нарадзіўся ўжо дарослым. Такой незвычайнай сталасці паспрыяла вайна. Маленькі Толік дапамагаў партызанам, сам таго не ведаючы. Маці, Галіна Сямёнаўна, калі ішла на заданне даведацца пра апошнія падзеі ў горадзе, брала з сабой трохгадовага сына; мазала яго зялёнкай, перад нямецкім пастом пляскала яго па мяккім месцы — і Толік пачынаў плакаць. У немцаў не было сумнення, што ён хворы на воспу. Маці з сынам без перашкодаў траплялі ў горад...

Тэма Вялікай Айчыннай вайны з ранняга маленства трывала ўвайшла ў псіхалагічны, эмацыянальны стан паэта, знайшла адлюстраванне ў вершах «Памяць», «Мы нарадзіліся такімі», «Франтавыя дарогі», «Колькі блізкіх і родных імён», «У Брэсцкай крэпасці», дзе сказанае пра сябе стала прыналежным да пакалення дзяцей вайны, як іх асабістае і запаветнае.

Пасля вайны вучыўся ў СШ №7 Полацка, а ў 1956 годзе стаў студэнтам філалагічнага факультэта Полацкага педагагічнага інстытута, пазней факультэт перавялі ў Магілёўскі педагагічны інстытут. Пасля заканчэння вучобы ў 1961 годзе працаваў дырэктарам Бароўскай вячэрняй школы Магілёўскага раёна, з 1968 года выкладаў гісторыю беларускай літаратуры ў ВДУ імя П. М. Машэрава. Памёр 18 снежня 2002 года.

Кандыдат філалагічных навук, аднакурснік паэта Анатоль Емяльянаў успамінаў:

– Памяць вядзе ў 1957 год, калі ўпершыню сустрэўся ў студэнцкай аўдыторыі Полацкага педагагічнага інстытута з Анатолем Канапелькам. Перада мной стаяў па-сапраўднаму светлы чалавек з незвычайна цёплымі вачыма, акуратны, падцягнуты. Усе пяць гадоў вучобы ў інстытуце ён быў выдатнікам. Мне пашчасціла жыць з Толем у адным пакоі ў студэнцкім інтэрнаце. Прыгадваюцца літаратурныя вечарыны, на якіх пачынаючы паэт напеўна, як Рыгор Барадулін, чытаў свае вершы. Неаднаразова ездзіў на нарады і семінары маладых пісьменнікаў...

У сваёй творчасці Анатоль Канапелька захоўваў і працягваў класічныя традыцыі нашай нацыянальнай паэзіі, свядома арыентуючыся на лепшыя ўзоры паэзіі Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Уладзіміра Караткевіча, пераклікаючыся з паэтамі-равеснікамі Рыгорам Барадуліным, Генадзем Бураўкіным, Міхасём Стральцовым, Давідам Сімановічам. Ранняя паэзія Анатоля Канапелькі ў асноўным мажорная па сваім настроі: адчуваецца бадзёрасць, захапленне навакольным светам, радасцю жыцця, усведамленнем сваёй значнасці ў свеце:

Мой свет адкрыты шчасцю
І дабрыні людской.
Нялёгка песню скласці
І стаць самім сабой [1, с.45].

У літаратурным наробку паэта сваё пачэснае месца займае грамадзянская лірыка і вершаваная публіцыстыка, прадыктаваная логікай светаадчування лірычнага героя. Бязмежная любоў да Бацькаўшчыны, нацыянальнай спадчыны, паважлівыя адносіны да роднай мовы і культуры, бескампрамісныя адносіны да бездухоўнага і нізкага вызначылі творча-грамадзянскую пазіцыю Анатоля Канапелькі.

Урачыста-песенная інтанацыя, узрушанасць і прачуласць яднаюць верш «Роднае слова» віцебскага паэта з вершам «Родная мова» Пімена Панчанкі:

Адкрываю, як свет, нанова
беларускае роднае слова,
пералівістае — як каменьчык,
вясёлкавае — як ручэй,
цёплае — як агеньчык
добрых тваіх вачэй,
светлае — як маланка,
гнеўнае — як пярун,
ціхае — як калыханка,
вечнае — як Беларусь! [1, с. 9]

Усё жыццё побач з Анатолем Мікалаевічам былі шчырыя, таленавітыя людзі — яго сябры, падтрымка не толькі ў асабістым жыцці, але і ў творчай дзейнасці. Вершы паэта мелі сваіх канкрэтных адрасатаў, многія з іх прысвечаны землякам-літаратарам Петрусю Броўку, Уладзіміру Караткевічу, Васілю Быкаву, Еўдакіі Лось, Рыгору Барадуліну, Марыі Баравік, сябрам, калегам Зінаідзе Канапельцы, Давіду Сімановічу, Мікалаю Цішачкіну, Уладзіміру Папковічу.

Анатоль Канапелька са студэнтамі

У лірыцы позняга часу, прасякнутай магістральнымі радкамі «Я кожны дзень сябе знаходжу...», шмат філасофскіх рэфлексій, медытатыўнай танальнасці. Элегічныя вершы-роздумы («Яшчэ адна восень паляцела ў вырай», «Не трэба чалавеку адзіноты», «Не хавайце сваіх усмешак», «Лістапад», «Адыходзяць сябры, адыходзяць») звернуты да вечных ісцін і каштоўнасцей, вялікай стваральнай сілы прыгажосці і дабра. Несумненна, значныя набыткі паэта і ў асэнсаванні тэмы кахання. Інтымная лірыка А. Канапелькі акрэслівае характэрную асаблівасць яго героя: вернасць пачуццю, павагу да жанчыны. Унікальная з'ява ў беларускай паэзіі: любоўныя вершы прысвечаны адзінаму каханню — жонцы Святлане. Вобразы прыроды гарманічна спалучаюцца з пачуццямі закаханых у вершах «Зорка Святлана», «Завея круціць, як прадонны вір», «Маёй любові снежны зарапад», «Любімая, не трэба сумаваць». Вобраз вечна летняга эдэмскага сада персаніфікуецца ў вобраз беларускага зімовага сада, над якім «...любові ціхі зарапад // плыве ў прасторы хараства зямнога» [1, с. 57].

Адметнасцю семантыка-эстэтычнага поля паэзіі Анатоля Канапелькі з'яўляецца выверанае, устойлівае захаванне і працяг класічных традыцый беларускай нацыянальнай паэзіі. Творца таленавіта, па-мастацку аб'яднаў у сваёй лірыцы грамадзянска-публіцыстычныя і філасофска-медытатыўныя матывы, прадэманстраваў высокае майстэрства стварэння паэтычнага вобраза, сімвала, мастацкай дэталі, разнастайных прыёмаў і сродкаў.

Высокай ацэнкі заслугоўвае перакладчыцкая дзейнасць віцебскага творцы. З польскай мовы пераклаў балады і вершы свайго земляка з Расоншчыны Яна Баршчэўскага. Самай значнай працай стаў пераклад цыкла вершаў «Лісты да Юліі» — гімн сапраўднаму каханню і тым узнёслым, а часам і трагічным перажываннямь, што яму спадарожнічаюць. Кніга выйшла ў 2003 годзе ўжо пасля смерці Анатоля Канапелькі. Перакладчык, паважлівa адносячыся да аўтара, стаў пранікліым чытачом-суразмоўнікам, дасягнуў сэнсава-мастацкай адпаведнасці перакладу і арыгіналу, данёс да чытача акрыленыя словы любові і павагі да Маці-Радзімы:

Лятуць мае думкі ў край,
Дзе, кожны куточак помнячы,
З'явіўся б чароўнай поўначчу
У прысадах знаёмых ліп
І ўбачыў майго Анёла, –
Забілася б сэрца вясёла.

Імгненне жаданай сустрэчы
У росах сузор'яў тае.
Няхай бы хвілінка тая
Мне стала працягам у вечнасць
[2, с. 6].

На беларускую мову Анатоль Канапелька пераклаў вершы Тадэвуша Лады-Заблоцкага, расійскіх паэтаў Аляксея Мішына, Юрыя Палякова, Уладзіміра Прастакова; з цыганскай — Вальдэмара Калініна. У рэпертуары Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа ёсць спектаклі «Руслан і Людміла», «Праўда — добра, а шчасце — лепш», пераклады якіх на беларускую мову належаць пяру і таленту віцебскага творцы.

Анатоль Канапелька займаўся навукова-даследчай працай па праблеме літаратурна-мастацкіх традыцый Віцебшчыны ў кантэксце славянскіх культур, меў шэраг навуковых прац, прысвечаных Петрусю Броўку, Васілю Быкаву, Уладзіміру Караткевічу, Максіму Гарэцкаму, Аркадзю Куляшову. У газеце «Народнае слова» вёў рубрыку «Анталогія беларускай паэзіі». У 2003 годзе ў выдавецтве ВДУ ім П. М. Машэрава была выдадзена кніга Анатоля Канапелькі, якая падводзіла вынік яго шматгадовай навукова-даследчай дзейнасці — «Старонкі творчых біяграфій». Гэта зборнік творчых біяграфій пісьменнікаў, жыццё якіх было звязана з Віцебшчынай ад сярэднявечча да нашых дзён — каштоўная праца па гісторыі літаратуры паўночнага рэгіёну. У кнізе змешчаны імёны ад Францыска Скарыны да сучаснай віцебскай паэтэсы Людмілы Сіманёнак, для якой Анатоль Мікалаевіч быў настаўнікам і бацькам у свеце паэзіі. Але гэта не проста пералік фактаў жыцця, а ўласнае бачанне аўтара. Кніга дапрацоўвалася паэтам Уладзімірам Папковічам, бо пры жыцці Анатоль Мікалаевіч не паспеў гэтага зрабіць.

Педагагічная дзейнасць Анатоля Канапелькі пачалася ў 1961 годзе — сем гадоў працаваў дырэктарам школы. А з 1968 года — выкладчык гісторыі беларускай літаратуры ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава. Анатоль Мікалаевіч добра разумеў студэнтаў, заўсёды ішоў ім насустрач. Як ён сам казаў: «Я іх паважаю і ніколі не дазваляю сабе зняважыць іх годнасць. Лічу, што кожны выкладчык павінен быць, па-першае — чалавекам, па-другое — выкладчыкам. І шчасце, калі гэтыя абедзве якасці спалучаюцца». Здаецца, усё жыццё выступаў перад аўдыторыяй, прычым самай рознай, але ж перад тым, як зайсці ў студэнцкую аўдыторыю, заўсёды адчуваў хваляванне. Але потым, зведваючы эстэтычную асалоду, вёў студэнтаў у свет айчыннай літаратуры. А на яго лекцыі паціху, бывала, прыбягалі студэнты біялагічнага, матэматычнага, фізічнага факультэтаў. Ішлі «на Канапельку». Дарэчы, на працягу многіх гадоў кіраваў студэнцкім літаратурным аб'яднаннем «Заранačка». Усіх сваіх знакамітых сяброў: Рыгора Барадуліна, Уладзіміра Арлова, Генадзя Бураўкіна і іншых, калі яны бывалі ў Віцебску, заўсёды прыводзіў ва ўніверсітэт да студэнтаў.

Чалавек — сусвет, у якім кожны знаходзіў сабе месца, кожны мог атрымаць часцінку яго душы. Так было да 2002 года. Напярэдадні трагічнага дня ён, як заўсёды, развітаўся з калегамі на кафедры беларускай літаратуры, жартаўліва кінуўшы: «Канапелька пайшоў!..» І сапраўды пайшоў... на гэты раз назаўсёды. Анатоля Мікалаевіча, без перабольшання, ведала ўся гуманітарная, філалагічная Віцебшчына: нездарма ж адпрацаваў на педагагічнай ніве больш як сорак гадоў, уваходзіў у кіраўніцтва Таварыства беларускай мовы ад самага пачатку заснавання. Яго паважалі за дасведчанасць у справе, якой служыў, любілі за інтэлігентнасць і абыходлівасць, дабразычлівасць. У колах літаратурнай грамадскасці цанілі і шанавалі як адданага прыхільніка справы нацыянальнага адраджэння, паслядоўнага і настойлівага рупліўца на ніве беларушчыны.

Спіс літаратуры

1. Канапелька, А. Жыццё прадоўжыцца ў песні / А. Канапелька. — Віцебск: УА «ВДУ імя П. М. Машэрава». — 2010. — 73 с.

2. Баршчэўскі, Я. Лісты да Юліі: Вершы, балады / У перакл. А. Канапелькі / Я. Баршчэўскі. — Віцебск: УА «ВДУ імя П. М. Машэрава». — 2003. — 35 с.

Фота з архіва аўтара

Спадкапрыемца

Алесь БЫЧКОЎСКІ

Кажуць, кожныя сем гадоў чалавек мяняецца: абнаўляюцца кроў, клеткі, тканкі цела. Працэс адбываецца неўпрыкмет, зусім незаўважна. Міне сем гадоў хуценька, і чалавек ужо іншы, толькі знешнія абрысы перадаюцца разам з прыкметамі старасці. Я тое ўласнай скурай адчуваю. Бывае, зірну ў люстэрка, а адтуль быццам другі чалавек пысу выставіў. Здаецца, мо я і добры, аднак ужо трошкі не той. А старыя фотаздымкі з тадышнім сабою наогул выкідваю або спальваю ў качагарцы, каб не расчароўвацца, бо на іх ужо дакладна не я, а хтосьці іншы. За сем гадоў змяняюцца не толькі клеткі, але і ўнутранае начынне.

Мая работа лепшая ў свеце: вартаўнік і качагар у адным флаконе. «Ты, малы, як вырасцеш, паступай у інстытут на качагара вучыцца, — павучальна зазначаў у маім дзяцінстве адзін вусаты дзядзька. — Качагар з чалавекам заўсёды: ад радзільнага дома і да крэматорыя». Да слова, я ледзь не паступіў у інстытут на аператара ядзернага рэактара. Стрымала нешта, і ядзерным «качагарам» я так і не стаў, зрабіўся вартаўніком, аматарам кніжак.

Здаецца, збірае чалавек кніжкі ўсё жыццё, а каб папытаўся ў яго, навошта, дык і не пачуў бы нічога ўцямнага. Падабаецца, дый усё. Пасля чалавек памірае, і следам за гаспадаром паміраюць і кніжкі. Радні яны не патрэбныя, калі толькі не антыкварыят, які можна спіхнуць праз «Букініст». Радня вызваляе шафы і паліцы, валачэ аб'ёмістыя тамы дзясяткамі-сотнямі на сметнік, у макулатуру, у качагарку альбо здае ў раённую бібліятэку.

Але ж навошта старыя кніжкі бібліятэцы? Уласных процьма. Бібліятэцы падавай новае, свежавыдадзенае, прыдатнае для камерцыйнага фонду: баевікі пра спецназ, турму і так званы жаночы раман, дый які тузін модных аўтараў каб быў прадстаўлены. Таму старым кніжкам наканавана напраскі выпраўляцца ў макулатуру. Аднак тут у бібліятэку завітваю я. У мяне палова кватэры застаўлена стэлажамі, запоўненымі ўратаванымі ад смерці тамамі. Тут і Майн Рыд, і Эдгар По, і Якуб Колас, і Алесь Гарун, і іншыя. «Добра, што вы забіраеце, — ухваляе мае памкненні супрацоўніца бібліятэчнай сістэмы, немаладая жанчына, якая пачынала працаваць яшчэ ў тую эпоху, калі за права купіць том таго Майн Рыда ці По патрабавалася здаць цэнтнер макулатуры. — А так здадзім гэтыя кніжкі ў райзаг, а атрыманых грошай якраз хопіць купіць пару венікаў для бібліятэкі».

Я шкадую, што кватэрная плошча не дазваляе ўратаваць усе кніжкі. І люблю застыць каля паліц ды з ціхай радасцю перабіраць здабыткі. Мноства кніг у адным месцы ўтрымліваюць амаль містычны флёр непадуладнасці часу, каля паліц я пачуваюся нібыта побач з цэнтрам сусвету. Асаблівую павагу і трымценне выклікаюць надпісы на тытульніках, на ўнутраных баках вокладкі, зробленыя задоўга да майго нараджэння, яшчэ ў тую эпоху, калі кніга лічылася лепшым падарункам.

…Рэдка каму шанцуе з работай. Я ў шыхце шчаслівчыкаў. Работа дазваляе займацца любімай справай: чытаць і пісаць. Так, нельга знайсці кніжніка, які б сам не паспрабаваў аднойчы нешта сачыняць, хоць употай, для сябе, «у стол». Я пісаў апавяданні, і калі створанага сабралася дастатковая колькасць, я ўклаў іх у кнігу, раздрукаваў і выслаў рукапіс у малавядомае выдавецтва, кіруючыся логікай, што ў адрозненне ад выдавецтва я зусім невядомы. І хоць мінуў ужо месяц, як я выслаў поштай рукапіс, я раз-пораз усё ж перагортваў старонкі копіі, вызначаючы дробязныя памылкі-абдрукоўкі, у думках чырванеючы ад сораму і пасылаючы сабе кпіны. Сёння, даўшы сабе слова, што перачытваю рукапіс апошні раз, я нарэшце дабраўся да апошняй старонкі і адчуў пэўную спустошанасць. Патрабаваўся адпачынак, тайм-аўт. Я адклаў тэчку з паперамі і выбраўся на вуліцу, на агляд тэрыторыі, на свежае восеньскае паветра.

Арганізацыя, дзе я вартую, буйна квітнела ў эпоху, калі кніга лічылася лепшым падарункам, самыя высокія заробкі ў раёне былі тут. А цяпер памяшканне цэха вытворчасці электракабеля арэндавалі дзве фірмы калярытуальных паслуг. Адна вырабляе драўляныя крыжы, другая — могілкавыя помнікі. Бізнес у росквіце.

Раніцай я завітваю заадно і на тэрыторыю «помнікаў і крыжоў». Часам прадукцыя фірм складуецца пад адкрытым небам, і мне выпадае выхопліваць позіркам знаёмыя ў мінулым імёны на помніках, смяшлівыя і сур'ёзныя твары на фотаздымках. Цікавы час: людзям свярбіць паставіць помнік і абавязкова каб з фота, пажадана каляровым. І памерлыя пазіраюць з таго свету з хітрынкай, таямнічай загадкавасцю. Зразумела: яны ўжо зазірнулі, заглянулі цераз край, спасцiглі галоўныя таямніцы Сусвету, зведалі, нарэшце, навошта жылі, навошта збіралі, назапашвалі ўсё тое, пранесенае скрозь уласны век: пакуты, шчасце, багацце, нішчымнасць, ну ці кнігі… Жывыя ж тым часам спаборнічаюць, хто багацейшы помнік выправіць сваякам-нябожчыкам. З мармуру, граніту ці проста з армаванага бетону. Быццам грошы няма куды дзець, а багаты помнік забяспечыць на тым свеце Царства Нябеснае.



Фота www.ipiustitia.com

Косця з братам і адным наймітам габлююць крыжы, затым чысцяць наждачкай, пакрываюць лакам. У дзень атрымліваецца зрабіць крыжоў дзесяць-пятнаццаць. Я і не ведаў дагэтуль, што можна зарабіць на драўляных крыжах. Хлопцы здаюць іх оптам па дзвесце-трыста ў рытуальны магазін у Менску. Звычайны крыж оптам каштуе каля дваццаці рублёў, а вунь той з завіткамі па краях — дык і ўсе сорак…

Косця частуе мяне гарачай кавай, мы доўга разважаем пра марнасць і дарэмнасць і робім нечаканую выснову, што ўсё ж кожная рэч і з'ява наўкола існуюць не проста так, усяму знойдзецца сэнс і тлумачэнне.

— Кідай ты свае кніжкі, бабло трэба рубіць, таўчы капейку, — раіць Косця.

Мне адразу прыгадваецца іншы выпадак. У будынку раённай бібліятэкі месціцца філія вядомага банка, сустрэўся там знаёмы Толік, чалавек нявызначаных заняткаў, але пры грашах. Толік моцна здзівіўся, убачыўшы, што накіроўваюся ў бібліятэку.

— Хіба ты не ў курсе, што кніжкам хутка хана настане? Папяровыя ўжо знікаюць, іх месца займаюць электронныя. Ды і тое ненадоўга. Навошта чытаць, псаваць вочы, калі інтэрнэт існуе?..

Ёсць выпадкі, калі тлумачыць няма рады.

Люблю застыць каля паліц ды з ціхай радасцю перабіраць здабыткі. Мноства кніг у адным месцы ўтрымліваюць амаль містычны флёр непадуладнасці часу, каля паліц я пачуваюся нібыта побач з цэнтрам сусвету

…Весела і па-хатняму танчыць полымя ў зеўры катла. Пры жаданні тут можна напяць на металёвы пожаг скрылёк сала, як гэта рабіў у дзяцінстве каля бабінай печы, карыстаючыся відэльцам, а затым макаючы гарачым тлушчам на хлеб, у смак з'есці. Дзіцячая забава, але мне, мужыку сталага веку, ад яе палёгка і разнявольванне. Падсілкаваўшыся, бяруся зноў знішчаць старыя фота, сямігадовай і большай даўніны. Цяпер здымкі і ўвогуле асабістая інфармацыя захоўваюцца ў так званых «аблоках» паштовых сервісаў ды ў памяці камп'ютара, але я старамодны «рэтраград». Асобныя здымкі раздрукоўваю ў сябра на каляровым фотапрынтэры, а электронныя выдаляю. Фотаздымкі больш прыемна трымаць у руках.

Я прыхільнік спрошчанага жыцця і перыядычна вызваляюся ад залішніх рэчаў, у тым ліку і старых рукапісаў. Паверце, рукапісы гараць — ды яшчэ як, выдзімаюцца праз комін літары і словы, сказы і абзацы, якія не апраўдалі надзей. Навошта захоўваць тое, што лічыш памылковым і няўдалым? Дарэчы, я спаліў шмат рукапісаў, пакуль напісаў першае апавяданне, годнае для друку ў часопісе. І цяпер з лёгкай душой шпурляў у полымя таксама фотаздымкі. На іх я быў разам з жонкай. Праўда, гэта ўжо не я, а хтосьці іншы сямігадовай даўніны шчасліва пасміхаўся на каляровых вывах. Іншы чалавек са сваімі памкненнямі і матывацыяй.

Мы развяліся, бо я шмат піў. Ну, напраўдзе, піў я рэдка, раз у чатыры месяцы, але па два-тры тыдні. І яна аднойчы не вытрымала і паказала на дзверы. І тым мяне ўратавала. Бо каб цацкалася са мной далей, я б ужо пэўна заліўся гарэлкай і згарэў. Аднак разлад быў непахісным, лепшая палова стамілася дараваць мне, і я, згубіўшы надзею вярнуць былое, раптам зразумеў, што нельга сабраць да кучы і зляпіць з аскепкаў разбіты гладыш, варта зляпіць новы. Хтосьці ў падобнай сітуацыі страляецца, хтосьці топіцца, хтосьці п'е-жлукціць яшчэ больш. А я вырашыў пісаць, няма лепшай тэрапіі. Тым больш, што лепшая палова ўжо даўно з другім. А я штодня малюся Богу, каб забраў мяне, як толькі я ўздумаю вярнуцца ў твань містычных запояў, у якіх я падарожнічаў па прасторах пекла.

Час чакання ліста з выдавецтва пераваліў ужо на другі месяц, і восень надзейна ўвайшла ў сілу, раніцай сустракаючы дажджом, а ў вечары — холадам. Нарэшце далі цяпло ў кватэры, і ўжо не даводзілася ляскаць зубамі і грэцца ад газавай пліты. Нечакана пазваніла знаёмая бібліятэкарка з навіной пра паступленне чарговай партыі кніг, прызначаных у макулатуру, і прапанавала завітаць, выбраць тое-сёе сабе.

На гэты раз я вырашыў ўратаваць шыкоўнае выданне Шэкспіра. Дзіва, да гэтай пары ў плыні адпрэчаных гаспадарамі кніг Шэкспір мне яшчэ не трапляў. Разгарнуў кнігу і заўважыў надпіс, зроблены акуратным каліграфічным почыркам: «Дарагой Волечцы Казловай у гонар паўналецця. 15 сакавіка 1981 года».

Добра помню 1981 год. У той час, калі Вольга Казлова святкавала паўналецце, мяне адправілі ў абласную бальніцу выдаляць адэнойды. На наступны ж год я рыхтаваўся пайсці ў першы клас. А пасля ў 82-м памёр Брэжнеў, краіна паглыбілася ў смутак, а мая бабуля гаравала-бедавала, маўляў, будзе цяпер вайна з амерыканцамі і не будзе больш коржыкаў па восем капеек. І ў пацвярджэнне ўласных высноў бабуля насушыла два мяхі сухароў з чорнага хлеба, якія пасля размочвалі і з варанымі косткамі скармілі сабаку, а з камбікормам — свінням. Але ж перад тым я навучыўся чытаць і адкрыў для сябе невядомае вымярэнне прасторы-часу: вымярэнне літаратурнае, не прадугледжанае ні Эйнштэйнам, ні Лабачэўскім. Чытаць навучыла маці, пасвяціла мяне ў чароўную таямніцу, навучыла карыстацца здольнасцю кантактаваць з насельнікамі прыгаданага вымярэння.

…Калі я ўжо стаміўся чакаць і ўсур'ёз збіраўся адправіць у печ рукапіс зборніка апавяданняў, з выдавецтва прыйшоў адказ.

«З задавальненнем пазнаёміліся з вашымі творамі. Памеркаваўшы, вырашылі рэкамендаваць да друку і паставіць у выдавецкі план на наступны год», — значылася ў афіцыйным лісце. І далей прапанова падпісаць дамову.

Я сноўдаў пад самотнымі хмарамі, дождж ліў з пераменнай моцай, і я разважаў на тэму, што ўсё на свеце сапраўды мае сэнс, асабліва калі ўважліва прыглядзецца. На дзяжурстве я ішоў па тэрыторыі арганізацыі, дзе вартую, па завядзёнцы зазірнуў у куток «помнікі-крыжы». Быў вечар нядзелі, выходны, хлопцы пэўна грэліся-адпачывалі па хатах. На адным з гатовых помнікаў раптам заўважыў надпіс «В.М.Казлова. 15.03.1963–24.10.2018. Памяць мужа, дзяцей». Хуценька палічыў даты і скаўтнуў камяк. З фота на помніку глядзела звычайная жанчына, якая не страціла прыгажосці за гады, толькі самоцінка легла на твар дый цень скрухі і ціхай надзеі перад непазбежнай старасцю наплыў на ейныя вочы.

Доўга стаю перад помнікам, не зважаючы на вецер і імжу. Быццам трэба нешта падумаць-сказаць, а слоў няма, захраслі, зніклі.

Дома я ўзяў том Шэкспіра і запіхнуў далёка на паліцу. Ашчадліва і ўрачыста, быццам зрабіўся знарок нявольным сведкам і носьбітам памяці, у пэўнай меры спадкапрыемцам чужой долі любіць літаратуру. Спадкапрыемцам, якога гаспадыня кніжак ніколі не сустрэла ў жыцці, не бачыла і не чула, нават не ўяўляла пра існаванне, але нібыта дабраславіла з помніка.

У кішэні ляжала раздрукаваная дамова з выдавецтвам. Да наступнай змены клетак у арганізме, відавочна, было далёка, як да небасхілу, і адначасова блізка, як да неба…

Вечар Айчыны

Васіль БАРЫСЮК

Фота Дар'і Герашчанка

***

Яшчэ трошкі — і вочкі расплюшчацца:
пачынаецца ранак.
Прачынайся, мая беларусачка,
мілы тварык заспаны.

Мы з табой — і дзяржава, і нацыя.
На завулку адны мы:
несвядомасці дэфармацыя
на задворках Радзімы.

Апранаемся і — непрыкметныя –
на вучобу й на працу.
Не пісьменнікі ды й не паэты мы:
трэба добра хавацца.

Шапка нізка і цёплая хустачка –
нас пазнаць немагчыма.
Прывітанне, мая беларусачка!
Гэта вечар Айчыны.

Аднапавярховае Берасце

Мякка ляціць праз ноч
і ападае ў грады
першы вясновы дождж,
чорнай зямлі рады.

Там карані раслін
мерзлі ў чаканні выйсця:
сотні галін, сцяблін,
квецень, трава і лісце.

Там чарвякі ды гной
між артэфактаў, скарбаў...
“Соткі” імкнуцца ў бой
важкай зямною праўдай.

***

Зранку раптам рыкне рокер,
разрулі́ўшы ноч і дзень.
Потым дробненькія крокі –
во на працу як ідзе!
З добрым матам ды пляўкамі
па завулку мужычкі:
на чыгунцы іх рукамі
ў ноч медальныя рыўкі.
На машынах асцярожна
едзе офісны планктон.
Певень з крыкам пераможным
проста просіцца ў булён.
Разбрахаліся сабакі,
вераб'і крычаць сваё...
Хай жыццё даецца ў знакі –
падымайся, ё-маё!

Памежныя трохрадкоўі

Сонца падае на Цярэспаль,
дзе беларусаў больш, чым палякаў,
пакуль працуе “Бядронка”.

Дызельная плынь.
Тытунёвы вецер.
Пустыя вочы.

Хутка растуць дамы,
пакуль гаспадароў
не выгналі з мытні.

Польская вяндліна
на закусь гарэлкі з “дзьюціка”
з лёгім водарам газу.

Жаночы твар на мяжы:
кожны заезд у “бокс” —
новая зморшчынка.

Няшчасныя людзі,
што ведаюць кошты з абодвух бакоў,
болей не любяць шопінг.

Шчырыя людзі
лёгка адводзяць вочы
ад суседзяў-залётчыкаў.

Неверагодная радасць
двойчы на дзень
пасля апошняга шлагбаўма.

Пяюць салаўі
на двух берагах Буга
на адной мове.

Галоўнае — перайсці мяжу,
што ведаў з дзяцінства,
што будуеш сам.

***

Усе суседзі мае —
нармалёвыя:
злева — трымае тры крамы,
ззаду — цырульніца й двор дагледжаны,
справа — бухгалтарка — любіць расліны,
побач з ёй — пенсіянерка-дворнічыха –
з мятлой на паўстаўкі,
ну а насупраць — ужо й невядома,
што там у іх за любошчы.
Адзін толькі я
не часта складаю вершы.

***

Апошнія зялёнкі
збіраем у пяску:
верх — ад марозу звонкі,
ніз — просіцца ў руку.

І грукаецца ў кошык
зялёнае святло.
Яго не ўзяць за грошы,
не з'есці за сталом.

Я проста буду помніць
рабрысты халадок,
усюды шэрань, промні...
А на зубах — пясок.

Копіі паэтаў

Літаратурныя вобразы

Валянціна ОСІПАВА

Ганна Ахматава

Спявачка кахання.
Самоты царыца.
Салодкая песня,
якой не забыцца.

Хай век у калючых трымаў
рукавіцах,
але на спакусы
Парыжа і Ніцы
не стала мяняць
змрок паўночнай сталіцы.

Царыцу самоты,
песнярку адчаю,
не лаўрам душыстым,
а цернам вянчалі,
пакутай,
павенчанаю з маўчаннем...

Ад слёз і бяссонняў пустымі вачамі
у горкую бездань глядзела начамі.

Як ні галасілі надрыўна званіцы, —
ад страху збялелай старонкі агніцы, —
даверыла рэквіем роднай зямліцы.

І мусіў разгублена вораг дзівіцца:
Сараматніца ці,
можа, чарніца?

Са Слова старанна ствараўшы капліцу,
чароўнаю рыфмай змагла прычасціцца.

Канстанцін Бальмонт

З асцяро-ожнасцю здымайце
з даўніх ідалаў адзенне,
з тых, хто змучаны спакусай,
пакланяўся незямному;
заклікаў быць роўным Сонцу,
каб развеяць чары змроку,
і сакральнаю надзеяй
асвятляў шляхі людзей.

Ціха,
ўважліва шукайце
зерне мудрасці нябеснай,
што рассыпаў між радкамі
у размеранай стыхіі
той,
хто мог лунаць да зорак
у прарочым захапленні,
і грымотны водгук рэха
ў палкіх сэрцах абуджаў.

З даліка-атнасцю судзіце
тых,
хто жыць не мог без буры,
без дурманлівых пачуццяў,
і насуперак нягодам,
апяваў гульню імгненняў,
хай і выпусціў заўчасна
гуслі з аслабелых рук.

Барыс Пастэрнак

Куды там роўным,
важным крокам —
пад пахай з лютым — напралом!
Па кулінах,
ярах,
аблоках
бягом,
бягом,
бягом!
Змяшаць дажджы,
снягі,
бураны
ў адзіны калаўрот...
Імгненна,
лёгка,
без старання
пашырыць гарызонт.

І рытмы прыпусціць галопам —
да неба пыл узняць слупом!
Ад рэвалюцый і паклёпаў
бягом,
бягом,
бягом...

Пакінуць бег,
як дрэва — лісце,
і абмакнуць пяро з развагай,
каб думкі,
што схаваў калісьці,
даверыць доктару Жывага.

Максім Багдановіч

Зразумець гэта цяжка...
Балюча і горка.
Рок — суворы і жорсткі.
Бязлітасны — рок.
Толькі з песняю птушка
памкнецца да зорак,
як бярэ на прыцэл яе зоркі Стралок.

Хто раней,
хто пазней...
Не парушыш традыцый...
Трэба многа паспець за кароткі палёт,
і адбітак душы асвяціць у крыніцах
краю замкаў былых,
краю пушч і балот.

Прэч тугу
і дакучлівы клопат надзённы!
Песня ўскрэсне,
як Фенікс,
адрыне надрыў!
Пранікнёныя сэрцы акрыліць натхнёна
векавечна-нятленны
сардэчны матыў.

Напаказ,
напаказ!
Цёмных сувязяў шлейф,
з пагалоскай двубой
і эрота дурман –
чарадой,
чарадой...
Ўсё прыняць так, як ёсць:
і заганы, і дар...
Нелюбым быць — вось
гэта караю з кар!
...Старадаўніх гісторый пакутлівы груз,
і сімпатыі боскіх усмешлівых муз,
і бяздумнасць быцця,
і дум цяжкіх свінец
пераплавіць жыццё
ў вершаваны вянец.

Уладзімір Маякоўскі

З рыфмованых глыбаў чырвоны муляр
узняў манумент Слову.
Бліскучы свой дар
усклаў на алтар
пякучага дзеяслова.

Заўзяты трыбун,
скандаліст,
гарлапан —
загадку фрэйдыстам спрытным:
“Душа — арган
альбо барабан,
ці, можа, знямоглая скрыпка?”

Дазволіў любоўнай жарсці гуляць,
як мячыкам,
сэрцам трохкамерным,
на горла параненай песні — ўстаць
загадам і маршам бравурным.

Багам — богава!
Вольна! — ханжам.
Заўчасна памкнуўся ў неба...
Адчай — маўзеру,
вершу — душа.
Паэту шмат і не трэба.

Геній Адама Міцкевіча

Уладзімір АРЛОЎ

Паэт Адам Міцкевіч — у сузор'і самых славутых нашых суайчыннікаў. Ягоная радзіма — Навагрaдчына, адзін з найпрыгажэйшых куткоў Беларусі. Гэты край мае багатае мінулае.Тут стваралася Вялікае Княства Літоўскае, адбываліся іншыя значныя гістарычныя падзеі. Даўніна і непаўторная прырода навагрaдскай зямлі ўсё жыццё заставаліся ў памяці Адама, натхняючы яго на геніяльныя творы.Міцкевіч пісаў па-польску, але з дзяцінства выдатна ведаў і высока цаніў беларускую мову. Уся ягоная творчасць дыхае легендамі і паданнямі, звычаямі і абрадамі беларусаў-ліцьвінаў. «Радзіма Літва! Як здароўе, так ты, дарагая», — так пачаў Адам Міцкевіч сваю паэму «Пан Тадэвуш».

«Навагрaдчына, край мой дарагі»

Адам з'явіўся на свет у беларускай шляхецкай сям'і роду Рымвідаў-Міцкевічаў Каляднай ноччу 1798 года. Гэта здарылася ў фальварку Завоссе Навагрaдскага павета. Захавалася паданне, што павітуха, якая прымала роды, моцна верыла ў прыкметы і адрэзала немаўляці пупавіну на кнізе. Гэта «абяцала» хлопчыку вялікі розум і вучонасць.

І сапраўды, у чатыры гады Адась умеў чытаць, а затым стаў адным з найлепшых вучняў Навагрaдскай школы манахаў-дамініканцаў. Там вучыўся і вядомы паэт Ян Чачот. Хлопцы пасябравалі ды імкнуліся як мага болей часу бавіць разам. Яны часта блукалі па замчышчы з рэшткамі магутных вежаў, што некалі вытрымалі шмат варожых штурмаў. Адась і Янка ведалі, што ў Навагрaдку каранавалі князя Міндоўга, а ў Фарным касцёле вялікі князь і кароль Ягайла вянчаўся з Соф'яй Гальшанскай. Дарэчы, у гэтым самым касцёле маленькага Адама хрысцілі. Дзеі мінуўшчыны хвалявалі сэрцы падлеткаў, нараджалі ў іхніх рамантычных душах першыя сюжэты і вобразы.

Адася захаплялі і маляўнічыя навагрaдскія ваколіцы з узвышшамі, адкуль у ясны дзень відаць Налібоцкая пушча з хуткімі рачулкамі і таямнічымі азёрамі. Яго на ўсё жыццё зачаравала казачна чыстае круглае люстэрка возера Свіцязь.

Гушчар лесу пахне чаборам
і мёдам,
Жывіцы настоем смалістым.
Там возера Свіцязь, як шыбіна лёду,
Ляжыць паміж дрэваў цяністых...

(Пераклад Антона Бялевіча)

Адам Міцкевіч

Талент Міцкевіча хутка ўвабраўся ў сілу. Ягоныя вершы перапісвалі студэнты і гімназісты, іх чыталі ў дамах віленскіх месцічаў і на сходах таемных суполак.

Некалі на дно возера, каб не здацца ворагам, нібыта апусціўся цэлы горад. Гэтае паданне легла ў аснову Міцкевічавай балады «Свіцязь».

«Мэты святыя — шчасце для ўсіх»

Закончыўшы дамініканскую школу, Адам, як і Ян Чачот, паступіў у Віленскі ўніверсітэт. Юнакі былі ў шэрагах стваральнікаў і кіраўнікоў патрыятычных таварыстваў філаматаў і філарэтаў. У адным з вершаў той пары Міцкевіч заклікаў:

Разам, сябры маладыя!..
У шчасці для ўсіх —
нашы мэты святыя.
Розумам дужыя, ў цвеце і сіле,
Разам, сябры маладыя!..

(Пераклад Анатоля Вялюгіна і Сяргея Дзяргая)

Талент Міцкевіча хутка ўвабраўся ў сілу. Ягоныя вершы перапісвалі студэнты і гімназісты, іх чыталі ў дамах віленскіх месцічаў і на сходах таемных суполак.

Закончыўшы ўніверсітэт, Адам працаваў настаўнікам у Коўні. У 1822 і 1823-м пабачылі свет дзве яго кнігі. Туды ўвайшлі балады, рамансы, паэма «Гражына» і дзве часткі паэмы «Дзяды». На гэты твор маладога песняра натхніў беларускі абрад памінання продкаў.

У гады настаўніцтва Адам часта гасцяваў недалёка ад Навагрaдка ў маёнтку Туганавічы. Там ён закахаўся ў зямлячку-прыгажуню Марылю Верашчаку. Дзяўчына не хацела хаваць, што і яна кахае Адама. Аднак Марыля была заручоная і не пайшла супроць волі маці. Лёс назаўжды разлучыў закаханых, ды яны ніколі не забывалі адно аднаго. Марылі Верашчака паэт прысвячаў самыя пяшчотныя вершы, а потым падараваў на імяніны цудоўную баладу «Свіцязянка»:

Што там за хлопец
з абліччам прыветным
Поруч са стройнай дзяўчынай
Крочыць павольна
пад месяцам светлым
Берагам Свіцязі сіняй

(Пераклад Аляксея Зарыцкага)

Першыя ж кнігі Адама Міцкевіча прынеслі яму славу найлепшага паэта на землях былой Рэчы Паспалітай.

Турма і высылка

Многія сябры Міцкевіча — філаматы і філарэты — у 1823 годзе апынуліся ў мурах Віленскага базылянскага манастыра Святой Тройцы, пераробленага каланізатарамі ў турму. Адам сваімі вершамі мацаваў дух таварышаў па няшчасці.

Увосень 1824-га паэт, паводле прысуду, мусіў развітацца з Бацькаўшчынай. Міцкевіч жыў у Пецярбурзе, Адэсе, Маскве. Ён пазнаёміўся з дзекабрыстамі, з расейскімі літаратарамі Аляксандрам Пушкіным, Яўгенам Баратынскім, Пятром Вяземскім. Пясняр з Літвы-Беларусі меў апекуноў і абаронцаў, што высока цанілі ягоны талент. Вершы Адама перакладалі і друкавалі, у яго было шмат прыхільнікаў і прыхільніц.

У высылцы Міцкевіч стварыў напоўненую тугой па роднай зямлі лірычную нізку «Санеты». Яны лічацца шэдэўрам сусветнай літаратуры. Тады ж нарадзілася прысвечаная змаганню старадаўніх ліцьвінаў з крыжацкай навалаю паэма «Конрад Валенрод». У ёй хлопчыка-ліцьвіна Альфа крыжакі бяруць у палон і выхоўваюць, як немца. Але, вонкава скарыўшыся, юны палоннік ненавідзіць Тэўтонскі ордэн. Ягоным настаўнікам робіцца палонны пясняр-ліцьвін, што захоўвае вернасць роднаму краю. У бітве тэўтонцаў з ліцьвінамі Альф пераходзіць на бок суайчыннікаў і дапамагае ім перамагчы. Князь Кейстут за мужнасць і адвагу дабраслаўляе Альфа на шлюб са сваёй дачкой Альдонай. Каб канчаткова знішчыць Тэўтонскі ордэн, Альф пад імем Конрада Валенрода ўступае туды і пе-

Вайна з Вуніяй

Мы памятаем пра Берасцейскую царкоўную вунію 1596 года. Паводле яе нашы праваслаўныя продкі захавалі ўсе даўнейшыя малітвы, звычаі і абрады, але пагадзіліся з вяршэнствам рымскага папы. Гэта спрыяла міру і згодзе ў Рэчы Паспалітай, дзе жылі людзі розных веравызнанняў. Новую веру назвалі вуніяцкай, а вернікаў — вуніятамі. Пры канцы XVIII стагоддзя тры з кожных чатырох жыхароў беларускіх земляў маліліся ў вуніяцкіх храмах. Беларуская мова гучала там у прамовах-казаннях і ў царкоўных спевах. Па-беларуску ішло выкладанне ў школах пры вуніяцкіх цэрквах і манастырах. На нашай мове выходзілі вуніяцкія кнігі. Гэта значыць, што Вуніяцкая царква стала ў Беларусі сапраўды народнай рэлігіяй.

Царква ратуе народ

Вуніяты ведалі, што яны не палякі і не расейцы, бо маюць уласную веру. Якраз таму Вунію ненавідзелі свецкія і царкоўныя вярхі Расеі. Пётр I і ягоныя прыдворныя некалі забілі ў Полацку пецярых вуніяцкіх святароў і манахаў. Крывавае злачынства адбылося ў галоўнай вуніяцкай бажніцы — Сафійскім саборы. Сам храм пятроўскія салдаты (хоць яны былі хаўруснікамі Рэчы Паспалітай у вайне з Швецыяй) напярэдадні адыходу з горада падарвалі.

Пакуль ліцьвіны-беларусы мелі сваю дзяржаву і пазней, калі землі Вялікага Княства Літоўскага захапіла Расея,



Яўстах Тышкевіч. 1873 г.

Вуніяцкая царква працягвала служыць свайму народу. Пачынальнікі беларускага нацыянальнага адраджэння прафесары Віленскага ўніверсітэта Міхал Баброўскі ды Ігнат Даніловіч паходзілі з сем'яў вуніяцкіх святароў. Такім самым паходжаннем ганарыліся адзін з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры Ян Баршчэўскі, мастак Іван Хруцкі, гісторык Міхал Каяловіч, заснавальнік таемнага «Дэмакратычнага таварыства» Францішак Савіч.

Імператрыца Кацярына II абвясціла, што хоча выкараніць Вунію, і беларускіх вернікаў-вуніятаў пачалі перaводзіць у праваслаўе. У адказ на гвалт і здзекі шмат хто з прыхільнікаў народнай веры перайшоў у каталіцтва. Але як толькі Кацярына памерла, амаль усе былыя вуніяты вярнуліся да роднай царквы.

«Веры сваёй ламаць не будзем!»

Наступ на Вунію зноў узмацніўся пасля вызвольнага паўстання 1831 года. Вуніяцкія святары і манахі-базыляне багаслаўлялі змагароў, былі вернікамі, а часам самі ішлі ў лясы. Каланізатары павесілі замкі на сорак базылянскіх манастыроў.

Цар Мікалай I назваў іх «неприятельскими крепостями».

Асаблівa зацята і старанна змагаўся з нашай верай вуніяцкі біскуп Іосіф Сямашка, які перакінуўся на службу каланізатарам. Ён прымусова ўводзіў у духоўных семінарыях і царкоўных справаздачах расейскую мову. Святароў змушалі адпраўляць набажэнствы па царкоўных кнігах, прысланых з Масквы і Пецярбурга. На вачах у вернікаў ламалі і выкідалі з храмаў арганы, палілі на вогнішчах «шкодныя» вуніяцкія кнігі.

Па ўсёй Беларусі ў вёскі і мястэчкі пад аховай салдатаў прыязджалі царскія камісіі з папамі. Угаворамі і пагрозамі яны схілялі вуніятаў адмовіцца ад ранейшай веры і перайсці ў праваслаўе. Беларусы-вернікі працівіліся паўсюль — ад Бельска на захадзе да Мсціслава на ўсходзе.

У мястэчку Дзісна азвярэлая паліцыя за адмову стаць праваслаўнымі ўзялася «перахрышчваць» жыхароў павыдзіранымі з платоў жардзінамі. Самых упартых — сведчаць дакументы — пазбівалі так, што ў іх аказаліся ўспоратыя жываты і павыпадалі вантробы.

Полацкага праваслаўнага епіскапа і віцебскага генерал-губернатара, што наведаліся ў маёнтак Азярышча Гарадоцкага павета, каб перавярнуць жыхароў у праваслаўе, сяляне пастанавілі ўтапіць. Няпрошаныя госці, якія былі ўпэўненыя, што іхнія высокія пасады прымусяць вуніятаў падпарадкавацца, ледзьве ўратаваліся ўцёкамі.

Па Беларусі пайшла пагалоска пра тое, як бараніла сваю веру вёска Самулкі ў Чаўускім павеце на Магілёўшчыне. Прыбылая туды камісія запатрабавала ключы ад вуніяцкай царквы. Святар і вернікі адказалі, што паганіць храм не дазволяць. Тады імперскія служкі апячаталі царкву. Сялянаў спрабавалі падпаіць гарэлкай, потым паабяцалі, што за згоду прызнаць праваслаўе вызваляць іх ад усіх павіннасцяў. Вернікі заставаліся нязломнымі і пачуўшы пагрозу выслаць усю вёску ў Сібір. Некалькіх вяскоўцаў паліцыя закавала ў калодкі, астатніх збівалі, загадваючы прысягаць на крыжы маскоўскаму праваслаўю. Усё было марна. «Веры сваёй ламаць не будзем!», — сціскаючы кулакі, гучна сказаў за ўсіх вясковец Лявон Маркаў. «Не будзем! Не будзем!» — падхапілі жыхары вёскі, і камісія паехала назад ні з чым.

Словамі простага абаронца Вуніі селяніна Маркава назвала кнігу пра тыя падзеі іх сучасны

рамагае ў выбарах на пасаду вялікага магістра...

Такія творы не маглі падабацца ўладам. Адаму перадалі: рыхтуецца загад, што забароніць яму выехаць за мяжу. Не чакаючы гэтага, Міцкевіч назаўсёды пакінуў імперыю.

Рым, Лазана, Парыж

Еўрапейскія шляхі Адама Міцкевіча прайшлі праз Італію, Швейцарыю, Нямеччыну, Францыю... Паўсюль яго ўжо ведалі як выдатнага паэта і дзеяча вызвольнага руху. Ён быў прафесарам універсітэта ў швейцарскім горадзе Лазане. У славутай парыжскай навучальні Калеж дэ Франс для Адама Міцкевіча адмыслова стварылі катэдру славянскіх літаратур і прызначылі яго загадчыкам. На лекцыі Міцкевіча разам з студэнтамі прыходзілі французскія навукоўцы і літаратары.

З сваёй прафесарскай катэдры сын навагрудскай зямлі не раз распавядаў слухачам пра культуру роднай Літвы-Беларусі. Не абмінуў ён увагаю і беларускую мову. У адной з лекцый 1842 года Міцкевіч казаў: «На беларускай мове размаўляе блізу 10 мільёнаў чалавек. Гэтая гаворка найбагацейшая і найчысцейшая. Яна вельмі гарманічная і найменш з усіх славянскіх моваў зменена». Паэт нагадаў і пра тое, што «ў пару незалежнасці Літвы вялікія князі карысталіся беларускай мовай у дыпламатычным ліставанні», па-беларуску быў напісаны і выдадзены Статут Вялікага Княства Літоўскага.

У Парыжы Міцкевіч ажаніўся з Цалінай Шыманоўскай. У іх нарадзілася шасцёра дзяцей: дочкі Марыя ды Хелена і сыны Уладзіслаў, Юзаф, Аляксандр і Ян. Калі Цаліна цяжка захварэла, Адам сямнаццаць гадоў даглядаў яе.

Былы філамат захоўваў вернасць вальналюбным перакананням маладосці. Калі ў 1848 годзе Еўропу ахапілі рэвалюцыйныя падзеі, Міцкевіч накіраваўся ў Італію і стварыў з суайчыннікаў легіён, які змагаўся за вызваленне гэтай краіны. Вярнуўшыся ў Парыж, Міцкевіч быў рэдактарам перадавой газеты «Трыбуна народаў» . У сваіх артыкулах ён заклікаў еўрапейцаў яднацца ў руху да свабоды.

Дом-музей Адама Міцкевіча ў Навагрудку.
Фота С. Плыткевіча

«Пан Тадэвуш»

Самы знакаміты твор генія — напісаная ў Парыжы паэма «Пан Тадэвуш». Яе называюць энцыклапедыяй жыцця беларускай шляхты пачатку XIX стагоддзя. У паэме, што налічвае каля дзесяці тысяч радкоў, яскрава, з гумарам і нязбытным сумам па радзіме паказаны побыт, звычаі і норавы герояў з усімі іх станоўчымі якасцямі і заганамі. Міцкевіч бліскуча малюе сцэны паляванняў і святочных бяседаў, гарачых спрэчак і боек. Перад чытачом разгортваецца сапраўдная панарама тагачаснага жыцця, маляўнічыя краявіды Наваградчыны і запаведных налібоцкіх лясоў.

Дзеянне ў паэме адбываецца цягам пяці дзён у 1811 годзе і аднаго дня ў 1812-м. Гэта час, калі нашыя прадзеды чакалі ад французскага імператара Напалеона і яго Вялікай арміі вызвалення ад расейскага прыгнёту.

Галоўныя героі шэдэўра Адама Міцкевіча — закаханыя адно ў аднаго юнак Тадэвуш і дзяўчына Зося. Яны паходзяць з шляхецкіх родаў Сапліцаў і Гарэшкаў, што супернічаюць перад сабой. Пан Тадэвуш невыпадкова мае тое самае імя, што і Касцюшка. Ён разумее: дзеля свабоды Айчыны шляхце трэба забыцца на сваркі ды звадкі і разам змагацца з агульным ворагам.

Тадэвуш марыць пра аднаўленне Рэчы Паспалітай і разам з тысячамі патрыётаў-ліцьвінаў далучаецца да напалеонаўскіх войскаў. Ён, як і сам паэт, верыць, што адроджаная краіна будзе мець дэмакратычны дзяржаўны лад. Набліжаючы той час, пан Тадэвуш вызваляе ад прыгону сваіх сялянаў.

Пры канцы паэмы Міцкевіч прадказвае будучыню роднага краю:

Тады з дубовымі вянкамі славы,
Пакінуўшы мячы, абсядуць лавы
Героі нашы слухаць спеў цікавы!
Калі зайздросціць будзе свет іх долі,
Час будуць мець пачуць пра дні няволі
Бацькоў сваіх і лёсы іх уцяміць,
І твару іх тады сляза не спляміць.

(Пераклад Пятро Бітэля)

Халера ў Канстанцінопалі

У 1855 годзе Адам Міцкевіч выправіўся ў Турцыю. У сталіцу Асманскай імперыі яго прывялі зусім не літаратурныя клопаты. Ішла расейска-турэцкая (Крымская) вайна. Хаўрусніцамі туркаў былі Францыя і Вялікабрытанія. Міцкевіч пачаў фармаваць з землякоў легіён для дапамогі французам і брытанцам. Ён з натхненнем пісаў пра высокі баявы дух суайчыннікаў і спадзяваўся, што яны будуць ваяваць і за адраджэнне Рэчы Паспалітай.

Тады ў Канстанцінопаль (Стамбул) прыйшла эпідэмія халеры. Лічыцца, што Адам захварэў і не здолеў перамагчы хваробу. Аднак ніхто з трох дактароў, якія аглядалі Міцкевіча, не выявілі ў яго прыкметаў халеры. Таму шмат хто з біёграфаў паэта мяркуе, што ён быў атручаны. Першым чынам зацікаўленыя ў гэтым былі ўлады Расеі.

У апошнія хвіліны Адам Міцкевіч папрасіў перадаць сваім дзецям, каб любілі і падтрымлівалі адно аднаго.

Цела Міцкевіча перавезлі ў Францыю і пахавалі на парыжскіх могілках. Праз некалькі дзесяцігоддзяў прах знайшоў вечны спачын у саборы святых Станіслава і Вацлава на ўзгорку Вавель у Кракаве.

На паклон да творцы

Помнікі Адаму Міцкевічу ўсталяваныя ў Менску, Вільні, Варшаве, у Кракаве і Пазнані, у Парыжы, Львове і Адэсе, у балгарскім Бургасе... У дзясятках гарадоў Еўропы — ад Рыму да беларускіх Ашмянаў — ёсць вуліцы імя песняра. Віленскі ўніверсітэт мае двор імя Адама Міцкевіча. Памятнымі дошкамі адзначаныя ў Вільні дамы, дзе жыў і ствараў выдатны сын беларускай зямлі. У адным з іх — на Бернардзінскай вуліцы — створаны музей Міцкевіча. Тут у трох невялікіх пакоях ён жыў у 1822 годзе: завяршаў паэму «Гражына» і часта сустракаўся з сябрам-філаматамі. У экспазіцыі музея — рукапісы вершаў і першыя кнігі геніяльнага Адама, ягоныя стол і крэсла.

Але, каб найглыбей зразумець творцу, трэба ўбачыць яго радзіму. Калі вы выправіцеся ў родныя мясціны Міцкевіча, абавязкова наведайце сядзібу ў Завоссі, дзе Адам нарадзіўся, а затым — дом-музей у Навагрудку, дзе прамінула ягонае дзяцінства. У музеі захоўваюцца дакументы, фамільныя партрэты і кнігі пра род Міцкевічаў, асабістыя рэчы Адама. Асабліва кранае настольны гадзіннік, што паказваў час творцу ў ягоным віленскім студэнцкім пакоі. Недалёка ад дома-музея — помнік песняру і дваццацімятровы курган Міцкевіча, насыпаны землякамі ў 1920-я гады.

У вандроўку на малую радзіму Міцкевіча не забудзьцеся ўзяць кнігу яго вершаў. Яны будуць па-новаму гучаць і на Замкавай гары, і ў Туганавіцкім парку, дзе Адам сустракаўся з каханай Марыляй Верашчака, і на беразе возера Свіцязь...

гісторык Святлана Марозава. Дзякуючы ёй вы зможаце даведацца, як вуніяты супраціўляліся каланізатарам. Магчыма, у кнізе «Веры сваёй ламаць не будзем» вы знойдзеце звесткі пра вашыя мясціны і сваіх прадзедаў, што мужна баранілі народную веру.

Людвік Беліковіч і графы Тышкевічы

Разам з простымі вернікамі ды святарамі Вунію адстойвала беларуская шляхта. Голас у абарону Вуніі смела падалі лагойскія графы Канстанцін і ЯўстахТышкевічы, што пазней сталі знанымі беларускімі гісторыкамі. Шмат ездзіў па Беларусі, заклікаючы шляхту не аддаваць на здзек народную веру, полацкі павятовы маршалак Людвік Беліковіч. У 1834 годзе ён склаў да цара зварот з патрабаваннем спыніць пераслед вуніятаў. На сходзе ў Віцебску гэты ліст падпісалі 172 шляхціцы. Імперскія ўлады прыгразілі, што ўсе яны пойдуць пад суд і пазбавяцца маёнткаў.

Неўзабаве імператару Мікалаю I прыйшоў новы зварот у абарону народнай веры ад 111 беларускіх вуніяцкіх святароў. Іх узначалілі інспектар Полацкай духоўнай семінарыі Адам Тамкавід і святар Іван Ігнатовіч. За імі ўсталявалі паліцэйскі нагляд, а затым выслалі ўглыб Расеі. Цар загадаў гэтаксама караць кожнага нязгоднага святара. Біскуп-здраднік Іосіф Сямашка выслаў з родных мясцін 29 аднадумцаў Тамкавіда і Ігнатовіча. Між лідараў пратэсту, асуджаных на высылку ў манастыр, быў і вуніяцкі святар Тамаш Хруцкі, бацька будучага слыннага мастака Івана Хруцкага.

Улады спадзяваліся, што запалохалі вуніяцкіх святароў, і пачалі збіраць подпісы за далучэнне да праваслаўя, якое называлі «воссоединением с истинной верой». У Беларускай царкоўнай акрузе з 680 святароў за «воссоединение» падпісаліся ўсяго 186, аднак гэта не перашкодзіла Сямашку і ягоным памагатым крывадушна паведаміць у Пецярбург, што пераважная бальшыня вуніятаў імкнецца як мага хутчэй уз'яднацца з праваслаўнай царквой.

Царкоўны «сабор» 1839-га

У 1839 годзе імперскія ўлады правялі ў Полацку так званы аб'яднаўчы царкоўны сабор. На яго ўдалося сабраць усяго трох біскупаў і дваццаць аднаго святара, што прынялі пастанову пра вяртанне вуніятаў у праваслаўе. Гэтую пастанову некалькі месяцаў хавалі ад народа. Царская служкі з страхам узгадвалі нядаўняе вызвольнае паўстанне і баяліся, што край зноў уздымецца супроць іхняе ўлады.

Перад так званым «саборам» у Беларусь увялі дадатковыя войскі. У Пецярбурзе вырашылі, што гэтага недастаткова. З Фінляндыі перакінулі сюды казацкі полк. Казакі вызначаліся адданасцю цару і лютасцю ў расправах з іншадумцамі. Казакоў па сотні размясцілі ва ўсіх гарадах і мястэчках Віцебскай, Менскай і Магілёўскай губерняў, дзе чакалі вуніяцкіх бунтаў. Адно тады ўлады наважыліся абнародаваць прынятую ў Полацку пастанову. Менскія вуніяты даведаліся пра яе ажно праз паўгода...

Правёўшы незаконны царкоўны сабор, каланізатары заўзята ўзяліся перарабляць былыя вуніяцкія храмы на праваслаўныя. У Беларусі яны знішчылі болей за тысячу старадаўніх арганаў. Праваслаўе не дазваляла ў цэрквах скульптурных выяваў Ісуса Хрыста і святых. Тысячы створаных нашымі мастакамі скульптур былі спаленыя. Велізарныя вогнішчы праваслаўныя папы пад аховаю паліцыі і салдат складалі з «неугодных Богу» вуніяцкіх абразоў і кніг.

Прычасце бізунамі

Вайна царызму з Вуніяй працягвалася з яшчэ страшнейшымі здзекамі. Непакорлівых сялянаў і мяшчан секлі бізунамі, саджалі ў астрогі, аддавалі ў салдаты або высылалі ў далёкія губерні імперыі. Цяжкая доля чакала і нязгодных святароў. Іх разлучалі з сем'ямі, пераводзілі ў дзякі (ніжэйшы чын у праваслаўнай царкве, які не мае ступені святасці), адпраўлялі ў манастырскія турмы ці ў расейскія гарады і вёскі. З ранейшых прыходаў знялі 1300 духоўных асобаў. 105 з іх за адданасць сваёй веры апынуліся за кратамі.

Пра тое, як царкоўныя і свецкія ўлады «ўз'ядноўвалі» беларускіх вуніятаў, з абурэннем пісаў расейскі пісьменнік і мысляр Аляксандр Герцэн. А вось папа рымскі Грыгорый XVI супроць знішчэння Вуніі ды пераследу вернікаў-беларусаў не пратэставаў. Папа баяўся еўрапейскіх рэвалюцый, а імператар Мікалай I быў яму тут верным хаўруснікам. Царскую імперыю нездарма называлі «жандарам Еўропы». Яе войскі заўсёды былі гатовыя рушыць на барацьбітоў за свабоду.

Выдаваная Герцэнам у Лондане газета «Колокол» надрукавала артыкул, дзе змагар з Вуніяй біскуп Іосіф Сямашка быў названы «Юдам, што высек сабе помнік на спінах безабаронных ахвяраў». «Колокол» паведамляў, як у адным з беларускіх мястэчкаў паліцыянт Навіцкі сек вернікаў-вуніятаў бізунамі датуль, пакуль тыя не пагаджаліся прыняць прычасце ад праваслаўнага папа. Чатырнаццацігадовы хлопчык не адрокся ад веры бацькоў і вытрываўшы дзвесце ўдараў бізуном. Падлетка секлі далей, і ён пагадзіўся на прычасце — ужо амаль канаючы ад болю.

Калі вы недзе пачуеце ці прачытаеце, нібыта беларусы з радасцю вярталіся ў праваслаўе, успомніце слёзы і енкі таго хлопчыка-вуніята.

«Мы не маскалі, каб так спяваць»

Былыя вуніяты адмаўляліся ад увядзення ў царкву расейскай мовы. Беларускія фалькларысты зрабілі запісы пра тое, што і ў другой палове XIX стагоддзя вернікі на загад папа заводзіць «Господи помилуй!» адказвалі: «Мы не маскалі, каб так спяваць».

Пасля Полацкага царкоўнага «сабора» каланізатары падзялілі жыхароў былога Вялікага Княства на праваслаўных і каталікоў. Царкоўныя і свецкія ўлады пачалі даводзіць, быццам каталікі — гэта палякі, а праваслаўныя — абавязкова «русские». Беларусам месца тут не заставалася.

Падрыхтаваўшы глебу забаронай народнай веры, царызм нанёс новы ўдар. У 1840 годзе Мікалай I выдаў указ, які забараняў у дакументах ужываць найменні «Літва», «літоўскі» і «Беларусь», «беларускі». Замест іх землі былога Вялікага Княства Літоўскага трэба было ва ўсіх афіцыйных дакументах называць «Северо-Западным краем». Жыхары гэтага краю мусілі забыць сваю мову і гісторыю.

Аднак насуперак намаганням чужынцаў продкі не хацелі рабіцца расейцамі. Сотні тысяч вуніятаў патаемна захоўвалі вернасць народнай рэлігіі. Беларусы-ліцьвіны не забывалі, што калісьці мелі незалежную дзяржаву, дзе панавала павага да людзей рознага веравызнання і паходжання.

Вызначэнне сябе

Адам ГЛОБУС

Вясновае плаванне

Парыж у траўні — свежасць, маладосць.
Караблікі вязуць па Сене дурняў.
Я разам з дурнямі, ні гаспадар, ні госць, —
плыву анталагічна і культурна.

Плывуць насустрач Луўр і Нотэр Дам,
палацы, паркі, фабрыкі, заводы.
Плывуць па рэчцы раб, кароль і хам.
Плывуць братэрства, роўнасць і свабода.

Эпітафія

Чалавечая справа чакала цябе,
ты прыходзіў і справу рабіў.
Ціхі ў радасці і нешматслоўны ў журбе –
працаваў, як працуюць рабы.

Ні выходных, ні святаў ніколі не браў,
дзеля справы і дыхаў, і жыў,
а калі прыпыніцца прыйшла пара,
ты стаў прозвішчам на крыжы.

Лад

Паціху ладую,
стаўляю, пакую.
Няспешна збіраю
і шчыльна шыхтую…

Скарбоны ў скарбонку.
Нататы ў нататнік.
Цытаты ў гарбатнік.
Гарбату ў цытатнік.

Бляшаны ў бляшанку.
Касілы ў касільнік.
Мабілы ў гадзіннік.
Гадзіны ў мабільнік.

Звяроў на гасцінец.
Гасцей у звярынец.
Пакуты ў закутак.
Пакутніка ў кут.

Ліст былому сябруку

Ты выбачай, мяне не будзе ў Менску,
не будзе на касьбе і на сяўбе,
не будзе ў Дзвінску і ў Нарафамінску,
мяне не будзе… Больш ніколі… Для цябе…

Настаўнік

Настаўнік піў — такая вось бяда.
Піў і дапіўся да канца, да смерці.
Сыйшоў адразу пасля першай чвэрці,
пакінуў вучняў, не дагадаваў.

Так несумленна, так несамавіта
настаўнік выбыў з нашае гульні.
Яго апошнім словам праклялі.
Ён уваскрос, і ён жыве… Нібыта…

Развітальнае

Бывай, Ахром. Плыві ў краіну сноў.
Цябе чакае вечны адпачынак.
Перажыванні, бойкі і злачынствы
ў мінулым. Пачынай усё наноў.

Цябе сустрэне там цвярозы Сыс,
прывеціць, праўдзе і ўсё пакажа.
Ты слухайся яго, бо гэта важна,
і помні, што найперш ты — піяніст.

Твой любы Скрабін, пэўна ж, будзе там.
Не будзе злыдняў, і не будзе здрадаў.
Царуюць там ураўнаважанасць і радасць.
Што тут казаць… Ты ўсё пабачыш сам…

Малюнак аўтара

Вызначэнне сябе

Злы, няўмольны, саркастычны,
сентыментальны, эратычны,
жорсткі, сквапны, разумовы,
кожны дзень нібыта новы…

Гаспадарка

Лёд у лядоўні,
лёзы ў лязоўні,
хлеб у хлябніцы,
соль у сальніцы.

Госці ў гасцёўні,
грошы ў грашоўні,
кроў у крывянцы,
Янка на Янцы.

Слёзы ў слязоўні,
мёд у мядоўні,
Бог у бажніцы,
звон у званіцы.

Эпітафія Міхалу

Давай паплачам… Міхала няма.
Быў і прапаў вясёлы светлы Міхал.
Ён маляваў, пісаў, спяваў, як дыхаў…
Давай паплачам… Міхала няма.

Ёсць нашы слёзы… Міхала няма.
Ёсць песні Міхала, і ёсць яго малюнкі,
яго карціны і паштоўкі-падарункі…
Ёсць нашы слёзы… Міхала няма.

Жывым — жывое, мёртвае — кладам,
куды паехаў назаўсёды Міхал,
і мы паедзем — добра, што паціху…
Жывым — жывое,
мёртвае — кладам.

Афарызмы



Эдуард ДУБЯНЕЦКІ

Заўсёды самыя цікавыя гутаркі атрымліваліся ў яго з самім сабой.

Светлыя мары аднаго могуць здавацца другому цёмнымі задумамі.

Яго ілюзіі разбіліся, бы шкло. Затое пасля гэтага нарэшце «склеілася» ягонае асабістае жыццё.

Будучыня іх цягнула ў адзін бок, а мінулае — у супрацьлеглы. У выніку яны так і засталіся стаяць на адным месцы.

Доўга шукаў сябе і нарэшце знайшоў — у бюро знаходак.

Дабро пераможа зло? Хіба толькі тады, калі яно само стане больш злым, а зло — больш лагодным.

Маўчанне — золата. Але ж як часта гэтым золатам карыстаемся не мы, а чужыя людзі!

Найгоршы ўплыў на грамадства аказваюць абмежаваныя людзі з неабмежаванымі ўладнымі паўнамоцтвамі і фінансавымі магчымасцямі.

Ён ніколі не кідаўся словамі, бо быў вельмі сквапным чалавекам.

Да тых, хто толькі марыць пра светлую будучыню і нічога дзеля яе набліжэння не робіць, наяве можа вярнуцца цёмнае мінулае.

Яму заўжды падабалася змагацца з млынамі. Але ў запале барацьбы з паветранымі млынамі ён часам забываў пра існаванне водных.

Марыў змяніць свет. Але не разлічыў сваіх сілаў, і неўзабаве свет змяніў яго да непазнавальнасці.

Ён не ўмеў кіраваць сабой. Але гэта яго зусім не бянтэжыла, паколькі ён кіраваў цэлай краінай.

Жыццё — тэатр. На жаль, найчасцей тэатр марыянетак.

Лёгка выходзіў з сябе, а вось вярнуцца назад без дапамогі іншых людзей ён не мог.

Дык гэта чалавек страчвае розум, ці, наадварот, розум страчвае чалавека?!

Брудныя намеры часам бываюць лепшымі, чым нібыта чыстыя дзеянні.

Ён злаваўся на свайго двайніка за тое, што той перашкаджае яму жыць. Цікава было б даведацца, а як ставіўся да яго двайнік?!

Знайшоў сваё месца ў жыцці. Але ж яно аказалася настолькі мулкім, што ён быў не рады такой «знаходцы».

Вар'яцтва ўзяло ў палон увесь свет. І, відаць, свет не мае ні жадання, ні сілаў уцячы з гэтага палону.

Моцна радаваўся таму, што змяняецца да лепшага. Але чамусьці яго сябры і сваякі станавіліся пры гэтым усё больш і больш сумнымі.

Ён быў гатовы здрадзіць Радзіме, але не паспеў, бо яна здрадзіла яму першай.

Дасягнуў пэўнага поспеху і пачаў лічыць сябе сапраўднай «зоркай». Аднак многія былі з ім не згодныя — у тым ліку і…зоркі на небе.

Бяздарная ўлада абавязкова прывядзе краіну не да ладу, а да поўнага бязладдзя.

Калі б бедныя раптам сталі багатымі, яны б не ведалі, што рабіць з тым багаццем. А калі б багатыя сталі беднымі, яны б не ведалі, як ім выжыць.

З безвыходнага становішча ёсць толькі адно простае выйсце: у яго не трапляць.

Змагаўся за народную волю, але ў выглядзе «ўзнагароды» ад уладароў атрымаў, на жаль, асабістую няволю.

Кожны чалавек мае процьму недахопаў. Але звычайна мы добра бачым гэтую процьму ў іншых людзях, хоць зрок найчасцей «слабее» тады, калі пачынаецца размова пра нашыя ўласныя недахопы.

Ставіў перад сабой высокія мэты. Але яму не хапала маштабу асобы, каб дацягнуцца да іх.

На любога майстра маніпуляцый калі-небудзь абавязкова знойдзецца сапраўдны грасмайстар маніпуляцый.

Нацыянальныя героі павінны аб'ядноўваць грамадства. А калі яны яго раз'ядноўваюць, то гэта сведчыць пра кепскі маральна-духоўны стан самога грамадства.

Пісьменнікі, калі да вас завітае Муза, адразу выганяйце яе! Бо калі яна пачне лашчыцца да вас, піць з вамі каву, распавядаць пра свае мары і г.д., то гэта надоўга адцягне вас ад галоўнай справы — (на)пісання шэдэўраў.

Кожны творца хоча напісаць хаця б адзін геніяльны твор. Але ж апошні сам выбірае таго творцу, кім бы яму хацелася быць напісаным.

Лічыў сябе геніем, а ўсе астатнія лічылі яго бяздарам. Так ён і застаўся ў памяці людской «бяздарным геніем».

Дэманы мінулага не давалі яму спакойна жыць. Урэшце ён іх выгнаў, але жыццё без іх стала вельмі сумным.

Ён спрытна пераскокваў перашкоды. А таму яны ніяк не маглі ўплываць на яго.

Адчайна змагаўся з рэальнымі і ўяўнымі ворагамі. Праўда, з цягам часу гэтае змаганне давяло яго да… адчаю.

Лічыў сябе лепшым з лепшых. А людзі лічылі яго горшым з горшых. У выніку ён быў змушаны прызнаць сябе лепшым з горшых (а мо горшым з лепшых ?!).

Сон спараджае пачвараў? Не, хутчэй пачвары спараджаюць жахлівыя сны.

Начныя кашмары — гэта было самае цікавае ў ягоным сумным (што)дзённым жыцці.

Хачу на мора, на пясок! Ды надта ж тонкі кашалёк…

Кожны чыноўнік хоча «ганяць» сваіх падначаленых. Але часцяком ён забываецца, што і яго хтосьці калісьці можа пагнаць паганай мятлой з утульнай пасады.

Выратавальная сіла мастацтва! Заўсёды ты ратавала і ратуеш людзей ад роспачы, здзічэння і вар'яцтва.

Надзея — зыркі маяк у моры самоты, які паказвае шлях да берага шчасця.

Залежнасць ад культуры — як наркотык. Паспрабаваў — наўрад ці потым кінеш. Паболей бы залежных нам такіх — глядзіш, культура б, можа, расквітнела.

Улада, якая затыкае рот іншадумцам і заганяе іх у сацыяльнае гета, у рэшце рэшт абавязкова загоніць сябе на задворкі Цывілізацыі і Гісторыі.

Каханне — дзіда, з дапамогаю якой мяркую выйграць я з самотай цяжкі бой.

Каб у яго не «паехаў дах», ён вырашыў увогуле адмовіцца ад даху над галавой і жыў пад адкрытым небам.

Бадай, кожны з нас піша сваю кнігу памылак. Ах, як жа нам, бывае, хочацца потым вырваць з гэтай кнігі некаторыя старонкі!

Развітанне з мяжой

Уладзімір МАРОЗ

Час развітацца з мяжою. Той, якая ўжо восемдзесят гадоў не існуе ў рэальнасці, але якая да гэтага часу існуе ментальна, псіхалагічна і метафізічна ў беларускай свядомасці і падсвядомасці...

Мы — апошняе пакаленне, для якога гэтая тэза справядлівая, для нашых дзяцей і ўнукаў мяжа тая ўжо не існуе, яна засталася проста фактам гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Але яго трэба ведаць, каб правільна зразумець найважнейшыя зрухі, якія ўрэшце склаліся ў сваёй метафізічна-энергетычнай моцы і прывялі да існавання незалежнай Рэспублікі Беларусь.

Да падзей 1939-га года падштурхнула праца над кнігай успамінаў майго бацькі Вікенція Мароза «Пражытае-незабытае». У часе рыхтавання тэкста, напісанага дробным і не вельмі разборлівым почыркам з абодвух бакоў шэрага аркуша паперы, мінулае наноў узяло ў палон. У тым пражытым маім бацькам было і пятнаццаць гадоў жыцця пад Польшчай. А 2019 год, юбілейны ад 1939-га, паклікаў яшчэ стварэнне дакументальнага фільма па маім сцэнарыі, які грунтаваўся якраз на гісторыі сям'і і асабістых згадках. Рэч у тым, што вёска маёй маці — Мікалаеўшчына на Стаўбцоўшчыне (хто не ведае радзіму Якуба Коласа?), а бацькава Цякалаўшчына на Нясвіжчыне месціліся літаральна за адзін-два кіламетры ад былой беларускай савецка-польскай мяжы, але на заходнім яе боку.

Калі дзед Іван вёз нас на возе з Цякалаўшчыны ў недалёкія госці да бацькавай сястры Шуры ў вёску Вялікая Раёўка (ужо Капыльскага раёна), адразу пасля невялікага лесу кідаліся ў вочы дзіўныя нязрушныя масіўныя бетонныя збудаванні — доўгатэрміновыя агнявыя кропкі. Стаялі яны каля лесу і пасярод поля, засеянага то збажыной, то бульбай, то буракамі, што кожнага разу дадавала свайго адценя для ўспрымання спарудаў. Бацька тлумачыў, што гэта былыя ўмацаванні на былой савецка-польскай мяжы, якая да 1939 года рэзала тэрыторыю Беларусі. На сёння ведаю, што гэта знакі-паршткі так званай «лініі Сталіна» (назва пайшла ў свой час ад нямецкай прапаганды і заходняй прэсы), бункеры для кулямётаў ці процітанкавых гарматаў. Яны ніколі так і не былі выкарыстаны па сваім абарончым прызначэнні. Як цікаўныя дзеці, мы лазілі па тых бункерах. Яны ўласна так і ўспрымаліся — як нечаканыя збудаванні для забавы.

А калі з Мікалаеўшчыны, перабрыўшы Нёман, хадзілі з дзедам Костусем (бацька маёй маці) у Паласенскі лес па ягады ці грыбы, ён часта вёў нас у нізіну сярод лесу, дзе была маляўнічая азярына, і казаў, што тут была польская стражніца на мяжы.

«Стражніца» — якое дзіўнае і таямнічае слова! Так з дзяцінства ўвайшла ў маю свядомасць мяжа. Праз памяць бацькоў і дзядоў метафізічнае адчуванне памежжа стала неад'емна маім.

Сапраўдная мяжа аб'ектыўна мае велізарную энергетыку і сілу, якая здольная змяняць лёсы людзей і народаў. Колькі разоў на працягу нашай гісторыі мяняліся межы Беларусі! І нават ішлі па жывому яе целу, што было з гістарычнага беларускага гледзішча вельмі балюча. Як пры трох падзелах Рэчы Паспалітай, якія адбыліся ў канцы XVIII стагоддзя. Тады праз 23 гады мы зноў сталі адзінай тэрыторыяй, нягхай і ў складзе Расійскай імперыі. І ўсё ж найбольш няпростай для беларускага ўсведамлення стала мяжа 1921 года, якая рэзала Беларусь па-жывому ды існавала 18 гадоў — да 1939-га.

Бацька мой (1924 года нараджэння) пайшоў у школу недзе ў 1931 годзе. Усе прадметы выкладаліся на польскай мове. Вершык малога паляка назаўсёды ўрэзаўся ў памяць: «Хто ты естэсь? // Поляк малы. // Які знак твуй? // Ожэл бялы». Але якім жа палякам быў мой бацька, калі ён быў беларусам! Толькі закон Божы выкладалі на рускай мове, праўда, потым надрукавалі падручнік на рускай мове лацінкай, што выклікала слёзы ў святара.

Яшчэ за «польскім часам» пайшла ў школу і мая маці Дзіна, 1929 года нараджэння. У яе нават польскі падручнік для дзяцей захаваўся з таго часу. Памятае, што на ўваходзе ў школу дзяцей сустракала цётка і прымушала выпіць рыбінага тлушчу (аб здароўі дзяцей клапаціліся!). Памятае, як на паханне Пілсудскага падвезлі на возе да школы ўяўную дамавіну, і кожны павінен быў кінуць туды жменьку пяску на памяць аб начальніку польскай дзяржавы. Так выхоўвалі з дзяцінства польскі патрыятызм.

Калі за прыватным глянуць на агульную карціну, то варта нагадаць энцыклапедычныя звесткі. Да 1921 года ў Заходняй Беларусі існавала 514 беларускіх школаў. У 1928 годзе іх заставалася толькі 69, тры працэнты ад усіх навучальных установ на гэтых землях. Але і яны ўсе былі зачыненыя да 1939 года. Даходзіла да таго, што любыя патрабаванні навучання на беларускай мове ўлады разглядалі як вынік камуністычнай змовы. У тым ліку і дзейнасць Таварыства беларускай школы (1921–1937гг.) на чале з Браніславам Тарашкевічам.

Не так і даўно з аповедаў бацькоў я акрэслена ўсвядоміў для сябе, што у нашых сем'ях былі выпадкі, калі мае крэўныя цярпелі за сваю беларускасць пры Польшчы. Брат

Фота www.1zoom.me

дзеда Івана дзядзька Лукаш скончыў настаўніцкую семінарыю, працаваў настаўнікам. У пэўны момант яму сказалі, каб перахрысціўся ў каталіцтва, інакш працаваць настаўнікам не зможа. Лукаш адмовіўся, і яго звольнілі з працы. А дзед Костусь служыў лесніком у Радзівіла. Жылі ў лесе, ад хутара да мяжы з Саветамі было зусім блізка. Польская выведка доўгі час (мо з паўгода) схіляла дзеда, каб ён супрацоўнічаў з імі, даносіў аб тым, што адбываецца на мяжы. Дзед так і не пагадзіўся. Без усялякіх тлумачэнняў яго вывезлі назад у вёску, службу ён страціў. Праўда, цяпер відавочна, што беларускасць ратавала яго, бо як лесніка маглі б ужо за «дугімі саветамі» выслаць, дэпартаваць у Сібір. У 39-м перад вайной яго прызвалі з рэзерву ў польскае войска, але пасля вызвалення Заходняй Беларусі ён вярнуўся дадому, як і многія мабілізаваныя беларусы.

Перыяд жыцця беларусаў пры Польшчы ацэнваюць па-рознаму. Але відавочна, што да беларусаў ставіліся ўсё ж як да людзей ніжэйшага гатунку. Я нарадзіўся ў горадзе Косава, куды пасля Нясвіжскай педвучэльні прыехалі настаўнічаць мае бацькі. Места адметнае — чаго варта толькі імя народжанага ў недалёкім фальварку Марачоўшчына Тадэвуша Касцюшкі! Вольналюбівы горад вызначыўся і тым, што тут у лютым 1927 года адбылася паўтаратысячная мірная дэманстрацыя рабочых і сялян супраць закрыцця Беларускай сялянска-работніцкай грамады. Дайшло да сутыкнення з паліцыяй, тая адкрыла агонь, шэсць чалавек было забіта, засталося шмат параненых...

Палітыка польскіх уладаў на паскораную асіміляцыю беларусаў (закрыццё беларускіх школ і гімназій) і палітычная бяспраўнасць насельніцтва заходнебеларускіх земляў была адкрытай, не прыхаванай. Польскімі ўладамі ў 1934 годзе быў створаны Бяроза-Картузскі канцэнтрацыйны лагер, куды трапляла і шмат простых беларусаў, а не толькі дзеячоў беларускага нацыянальнага руху. Усяго ў польскіх турмах сядзела блізу 1300 беларусаў-палітзняволеных. А пасля вызвалення ў 1939 годзе маштабныя рэпрэсіі ў Заходняй Беларусі праводзіў ужо сталінскі рэжым...

«Механізм» 39-га года добра распрацаваны ў гістарыяграфіі. Ён пачаў канкрэтна ўвасабляцца ў сваёй сутнасці пасля падпісання сакрэтных пратаколаў да пакта Молатава–Рыбентропа 23 жніўня 1939 года, па якім Савецкі Саюз і Германія падзялілі сферы ўплыву. Заходнія Беларусь і Украіна павінны былі адысці да савецкай дзяржавы «пад маркай» уз'яднання беларускага і ўкраінскага народаў. І ўжо праз тыдзень, 1 верасня, нападам Германіі на Польшчу пачалася Другая сусветная вайна. Варта ўсвядоміць, што і для Беларусі яна пачалася якраз у гэты дзень, бо ў польскай арміі, якая абараняла Варшаву (і не толькі) было шмат салдат-беларусаў. Даследчыкі ацэньваюць іх колькасць з улікам мабілізацыі 1939 года звыш сарака тысяч чалавек.

Нацысты сваю дамоўленасць выканалі. Пачалася аперацыя «Гляйвіц», 14 верасня яны былі ўжо ў Брэсце. Толькі ў Брэсцкай крэпасці яшчэ было супраціўленне. А Сталін марудзіў, не хацеў выглядаць агрэсарам. І толькі 17 верасня пачаўся вызваленчы паход Чырвонай арміі, як ён называўся ў савецкай гістарыяграфіі. Праходзіў ён амаль без супраціўлення, хоць сутычкі ўсё ж былі. Па-рознаму сустракалі людзі ў Заходняй Беларусі савецкія войскі, большасць усё ж з надзеяй на разняволенне ды лепшае жыццё. А якое было жыццё ў Савецкай Беларусі — ніхто толкам і не ведаў.

Уз'яднанне ў верасні 1939 года было больш мілітарысцкім і прапагандысцкім актам, чым рэальным знішчэннем мяжы. Яна заставалася, «заходнікаў» не прапускалі ва Усходнюю Беларусь. Трэба было мець спецыяльны дазвол. Адно што была савецка-польская мяжа, а цяпер мяжа стала беларуска-беларускай. Рэальна яна знікла толькі пасля вайны, а вось ментальна-псіхалагічны падзел існаваў доўгія дзесяцігоддзі.

Цікава зазначыць, што 1939 год адыграў адметную ролю ў лёсе народных песняроў Беларусі Якуба Коласа і Янкі Купалы. Калі першым сакратаром ЦК КПБ у 1938 годзе прызначылі Панцеляймона Панамарэнку, той пачаў разбірацца з беларускай сітуацыяй. І напісаў ліст Сталіну, па якім песняроў неадкладна трэба было калі не расстраляць, то тэрмінова выслаць у Сібір. Але замест гэтага Сталін узнагародзіў іх ордэнамі Леніна. Бо ў правадыра краіны Саветаў ужо быў план агрэсіі супраць Польшчы (у тым ліку і вяртання Заходняй Беларусі), таму яму не патрэбны былі нейкія гучныя справы ў Беларусі Савецкай. Наадварот, трэба было падкрэсліць, што тут усё цудоўна. Так вось і засталіся жывымі пісьменнікі, і ордэны займелі. І Панамарэнка ў гэтай справе (ордэры на ордэны) абсалютна не пры чым.

У мяне няма сумневу, што Якуб Колас і Янка Купала, нягледзячы на тое, што яны цудоўна ведалі, у якой сістэме жывуць, шчыра віталі ўз'яднанне беларускага народа. Не толькі як патрыёты сваёй зямлі, але і ў звязку з малой радзімай, якая была адсечана мяжою. Колас у газеце «Звязда» пісаў сваім аднавяскоўцам-мікалаеўцам на запрашэнне наведаць вёску: «Даўно мяне цягне свой родны куток, дзе я гадаваўся, вучыўся, дзе правёў свае маладыя леты, куток, якога я не бачыў ужо з 1915 года. З гэтага часу я бываў у Мікалаеўшчыне толькі ў мыслях ды сне. Сніліся мне і Канцывалокі, і Міхалаў крыж, і Дуброўкі, і Лядзіны, і Бервянец, і Раймусавая шырокая, і Высокі бераг, і сотні іншых урочышч, якія цяжка пералічыць... Граніца, разлучаўшая нас дзясяткі гадоў, сцёрта...».

1939 год для нас асабліва сумна-адметны тым, што беларусы назаўсёды страцілі маці-Вільню. У горад савецкія войскі ўвайшлі 19 верасня. Вільня для Заходняй Беларусі была галоўным горадам краю, яго культурным і навуковым цэнтрам. Адразу была створана беларуская адміністрацыя. Але беларускай Вільня пабыла ўсяго некалькі тыдняў. У Сталіна ўжо быў план перадачы горада Літве, каб улашчыць літоўцаў перад будучай акупацыяй іх краіны. На беларусаў ён не зважаў.

Працяг на стар. 16 (10) »

« Працяг.
Пачатак на стар. 15 (9)

Але жыццё ішло сваім шляхам, беларусы сталі жыць разам. Тым, хто называе далучэнне земляў Заходняй Беларусі да Беларусі Савецкай у 1939 годзе акупацыяй Польшчы, мне хочацца задаць пытанне: а як назваць тое, што адбылося ў пачатку 20-х гадоў мінулага стагоддзя? Акупацыяй палякамі беларускіх земляў. А як аднесціся да падзеі 1921 года пад назваю Рыжскага міру? Першапачаткова мірныя перамовы савецкай Расіі з Польшчай пасля вайны меркавалася правесці ў Баранавічах ці Мінску. Але як тады абысціся без беларусаў? Прыдумалі, як без беларусаў: падпісалі дамову ў Рызе. Вось і падзялілі нас без нас. Да падпісання Дагавора не дапусцілі ні прадстаўнікоў савецкай Беларусі, ні дэлегацыю БНР. Як адзначаў вядомы беларускі навуковец і нацыянальны дзеяч Аркадзь Смоліч, «такі палітычны падзел Беларусі не абапіраецца ні на якія геаграфічныя асновы. Межы праведзены па жывому целу Беларусі...». Паэт Алесь Дудар у сваім вершы канстатаваў: «Пасеклі наш край папалам».

У 1921 годзе значная частка этнічнай беларускай тэрыторыі адышла да Польшчы — больш за сто тысяч квадратных кіламетраў з насельніцтвам звыш чатырох з паловай мільёнаў чалавек. Усходняя частка Беларусі належала РСФСР. Уласна Беларуская рэспубліка на той момант уяўляла сабою маленькую пляму на мапе, існавала ў межах шасці паветаў Мінскай губерні з насельніцтвам паўтара мільёна чалавек. І толькі ў 1924-м і 1926-м гадах Беларусі былі вернуты яе спрадвечныя ўсходнія землі — паветы колішніх Гомельскай, Магілёўскай, Смаленскай і Віцебскай губерній. Пасля узбуйнення насельніцтва Усходняй Беларусі склала каля пяці мільёнаў чалавек, што было ўжо суадносна з Беларуссю Заходняй.

Нягледзячы на гістарычныя перапрусы, нашыя гоні-палі, лясы-бары, нашыя рэкі-азёры, вёскі і гарады заўсёды заставаліся з намі. І гэтая нязрушанасць — надзейны падмурак існавання Рэспублікі Беларусь

Уз'яднанне 1939 года належала аформіць адпаведным юрыдычным чынам. Вольні для беларусаў — не было, і ў прапагандысцкай хронікі тых гадоў цэнтрам Заходняй Беларусі абвесцілі Беласток. Якраз тут 28–30 кастрычніка 1939 года ў будынку гарадскога тэатра адбыўся Народны сход Заходняй Беларусі, які прыняў адпаведныя дакументы. Гэта дэкларацыі «Аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі», «Аб дзяржаўнай уладзе», «Аб канфіскацыі панскіх земляў», «Аб нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці» (з яго ўведаў, што ў Гродні пры Польшчы існаваў веласіпедна-матацыклетны завод). Потым былі прынятыя законы Вярхоўнага Савета СССР і БССР аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў БССР. Дарэчы, у беларускім законе ад 14 лістапада 1939 года зафіксавана азначэнне «вялікі беларускі народ».

Як беларус, я таксама падпісаўся б пад словамі «ўз'яднаць беларускі народ у адзінай дзяржаве і пакласці канец тым самым раз'яднанню беларускага народа», негледзячы на акалічнасці геапалітычнай і мілітарнай сітуацыі і выразны пафас фармулёвак.

Недасведчаны чалавек у сённяшнім польскім Беластоку аніяк не пазнае былы беларускі горад. А свядомы беларус будзе памятаць, што з гэтым горадам звязана адна з важнейшых падзей нашай найноўшай гісторыі: уз'яднанне беларускага народа ў адзінае цэлае. Дарэчы, у Смаленску на будынку былога дваранскага збору (цяперашні будынак філармоніі), дзе 1 студзеня 1919 года было абвешчана аб стварэнні Беларускай савецкай рэспублікі, вісіць адпаведная памятная дошка. Бачыў на свае вочы. А вось у Беластоку на будынку гарадскога тэатра, дзе адбыўся Народны сход, аніякай дошкі няма. На жаль, яна ніколі і не з'явіцца, нават калі зварот (дапусцім нерэальнае) да польскага боку будзе прыняты на самым вышэйшым узроўні. Наадварот, калі мы рабілі здымкі па фільму «39-ы год» (канчатковая назва «Мяжа»), у цэнтры горада ладзілася фотавыстава, прысвечаная «100-годдзю вяртання Беластока ў склад Рэчы Паспалітай». Хітрая фармулёўка, не аспрэчыш... На сённяшні дзень Рэч Паспалітая выклікае найперш асацыяцыі з Польшчай, а тое, што Беласток — старадаўняе места Вялікага Княства Літоўскага, мала хто і згадае...

Аб'яднанне ў 1939-м годзе — адназначна пазітыўная падзея ў беларускай гісторыі. Я, да ўсяго, гэта ведаю і генетычна адчуваю ад сваіх бацькоў, дзядуль і бабуль, якія жылі ў тым часе каля самай рысы беларускага раз'яднання — былой савецка-польскай мяжы. Бо незалежна ад мяжы мы ўсё роўна заставаліся, як і спрадвеку, беларусамі.

Нягледзячы на гістарычныя перапрусы, нашыя гоні-палі, лясы-бары, нашыя рэкі-азёры, вёскі і гарады заўсёды заставаліся з намі. І гэтая нязрушанасць — надзейны падмурак існавання Рэспублікі Беларусь як суб'екта гісторыі, што і стала ўрэшце аб'ектыўнай рэальнасцю. І гэта, на мой погляд, ужо незваротна, як незваротна коцікі воды мая беларуская рака Нёман да свайго акіяна без аніякіх межаў.



Фота www.pixabay.com

Усё таемнае...

З цыкла «Яны і яна»

Альжбета КЕДА

Яна вельмі любіць гэтую Паэтку. Захапляецца яе вершамі, якія адгукаюцца ў душы мелодыяй.

Паэтка была незвычайна прыгожай. Мо нават не знешне, не рысамі твару, нязвыклага між паэтак беларускіх. Быццам асоба з далёкага Каўказа: цёмныя валасы, чорныя вочы, прадаўгаваты нос, арліны профіль. Высокая, статная, крыху мажная, нат і ў маладым веку.

Па нацыянальнасці руская. Асеннева. Недарэмна ж паэтка восені, як яе назвалі яшчэ ў дваццатыя гады. Пра творчасць, ды і пра жыццёвы шлях напісана багата. Асабліва ў часы вяртання, у першай палове дзевяностых. А ў другой палове дзясятых ужо новага стагоддзя пісала хіба што толькі яна. Здзіўляла яе тое, як дасведчаныя, старэйшыя калегі-літаратуразнаўцы тлумачылі прычыну вяртання Паэткі з сынамі з казахстанскае ссылкі, куды тыя трапілі як сям'я ворага народа, польскага афіцэра. Вось жа, быццам вызвалілі, бо клапаціліся пра яе нашы пісьменнікі: Янка Купала, Максім Танк... А яшчэ больш здзівіла, калі мала-дыя, а вельмі начытаныя, як мала хто з яго пакалення, даследчык айчыннай літаратуры ў сваіх кольках там фактах пра Асенневу паўтарыў той жа міт. Сапраўды, калегі-пісьменнікі клапаціліся. Але, думалася ёй яшчэ тады, у мінулым стагоддзі: няўжо абарона творцаў свае каляжанкі ў тыя страшныя часы была ажно такой дзейснай? Калі б так было, то (яна ў гэта верыць) шаноўныя класікі нашыя зрабілі б усё, каб вярнуць з няволі ўсіх сваіх калегаў. Не надта ў тых жахліва-знішчальных справах да іхняга голасу прыслухоўваліся. Так разважала. Не давала ёй спакою падарожжа Паэткі ў Маскву з Казахстану. Асеннева напісала ўспаміны «У казахстанскай ссылцы», дзе і пра тую паездку распавяла: «На шосты дзень я шчаслівая заехала ў Маскву, знайшла па адрасе на канверце ліста маскоўскае НКВД (на Лубянцы), ізноў запаўняла там бясконцыя анкеты, адказвала на бясконцыя пытанні. Энкавэдысты стараліся намовіць мяне, каб я падпісала развод із маім мужам, але я адмовілася. І падумаць толькі, што мой муж якраз у гэтым часе быў там, на Лубянцы, можа, праз якую сцяну ад мяне, а я і не падазравала гэтага! Наагул, і па сённяшні дзень я не ведаю, нашто мяне маскоўскае НКВД выклікала аж з Казахстана? Ці яны хацелі паглядзець на мяне, ці намовіць на развод, ці яшчэ што. Урэшце рэшт яны сказалі мне, што за мяне «ходатайствуют» важныя асобы і што я, магчыма, буду звольнена з высылкі, а пакуль што маю ехаць назад у Казастан і аб усёй справе маўчаць. Я так і зрабіла. НКВД завезла мяне на станцыю, купіла білет і пасадзіла ў цягнік. Праз тыдзень я была ўжо ў нашым раённым мястэчку».

Гэты аповед ані не праясніў таго, што здарылася. Ён яшчэ больш заблытваў, пацвярджаў міт пра хадайніцтва пісьменнікаў, дзейснасць тых захадаў. Пытанні заставаліся. Галоўнае, якое ставіць і Асеннева: «Навошта выклікалі ажно ў Маскву?» Адказы пачала шукаць між радкоў. Шукала разам з Паэткай. «Ці яны хацелі паглядзець на мяне», — крыху смешна. Выклікаць з Казахстану (а такі ж нябліскі свет!), каб паглядзець на яе. Меркавала яна, што Паэтка і сама разумела абсурднасць такога дапушчэння. «Намовіць на развод», — гэта ўжо больш сур'ёзна. Але хіба ў Паўладары намовіць не маглі? Мо і не маглі. Сваіх «ніжэйшых» чыноў у курс справы ўводзіць не жадалі? Хто іх логіку зразумее. А далей чытаем: «...ці яшчэ што». Было прычынай. Яшчэ штосьці. Самае важнае, пра што Паэтка ва ўспамінах напісаць не магла. Пасля гэтага сказа мусіла б стаяць шматкроп'е: наступны пачынаецца са словаў «урэшце рэшт», якія падказваюць, што было яшчэ нешта, шмат нечага, што ўрэшце закончылася. Прымус да супрацы. Гэтага не магло не быць. Дзеля гэтага і выклікалі...

Шмат разоў вярталася яна ў думках у той страшны для Паэткі дзень, у тое страшнае месца. Перажывала, бы сваю ўласную бяду, пакуты жанчыны. І ўжо ведала: Асеннева пагадзілася. Закíдаў у «супрацоўніцтве» ў нашых выданнях было багата. Злыя закіды тых, хто ўмее адно каменем кінуць. Яна ведала, які «псеўданім», ці як гэта там у іх называецца, Паэтка сабе абрала. Спадчынны — можна і так сказаць. Была з роду, які даў свету вялікага рускага паэта. А ў творы класіка ёсць такі герой — Казбіч. Фільм «Бэла» паводле аповесці быў у яе дзяцінстве адным з самых улюбёных. Заўсёды плакала, калі гінула маладая, прыгожая, такая слаўная, мілая гераіня, забітая рукою Казбіча, які кахаў яе. І забойцу яна шкадавала не меней, чым ахвяру... Ці ведалі ка́ты, хто такі Казбіч?

Ніколі не асудзіла Паэтку за той страшны крок. Бо ўяўляла, як «угаворвалі», якія метады скарыстоўвалі. На шалі з аднаго боку пакладзены былі лёсы сыноў, жыццё любых хлопчыкаў. Сваё жыццё яна аддала б. Але катаванні ці вытрымала б? А з другога — папера, якую трэба падпісаць. Што выбера маці? Хто мае права асудзіць яе?

Так, яна сама далёка не заўсёды паслядоўная. Прызнае гэта. Бо тую, што за Паэткай ужо ў гады вайны віжавала, даносы ў тую ж кантору пісала, асуджае. І ведаць не хоча, як тая сэксоткаю стала. Мо і яе прымусілі, мо і ў яе дзеці? Была блізкай да Паэткі асобай, працавала ў беларускіх арганізацыях. Пісала пра Асенневу вельмі непрыязна. З непрыхаванай злосцю, а нат з пагардай малявала партрэт: пажоўклая скура твару, абвіслыя мяшкі пад вачыма. Адчувалася, як з кожнага слова веяла нянавісцю. А гэта ж было ў той час, калі Паэтка пахавала свайго сыночка, свайго першынца. І ад гэтага не адышла праз усё жыццё. То не дзіва, што тады так марна выглядала.

У гэтай сваёй непаслядоўнасці апраўдваецца прызнаннем Паэткі: «Я адкрыла ў сабе яшчэ адну рысу характару, да гэтага мне не знаную: я не ўмею зусім, без рэшты, дароўваць людзям учыненыя імі крыўды ці подласці. Чалавек, які зрабіў мне гэта, перастаўе існаваць для мяне як чалавек». Скарэктавала для сябе так: «Дарую крыўды, зробленыя мне, але не магу дараваць крыўды, зробленыя ім, духоўным лідэрам Беларусі, дзякуючы якім Беларусь існуе». Тая інфарматарка нічога асаблівага для сваіх куратараў пра Паэтку напісаць не магла. Адно толькі вылівала бруд на Асобу, якая поўнілася горам.

Думае яна часам: ці была хоць адна папера, хоць адзін данос, напісаны Асенневай-Казбіч? Хоча верыць, што не было.

Архівы, якія маглі б пра тое расказаць, недаступныя. А мо іх зусім няма?

Ды ўсё таемнае калісьці...

«І хай ніхто не пойдзе пакрыўджаным»

Ну вось, і пачала паціху атачаць нас імгла меланхалічнай восені.

Такому флегматычнаму часу якраз, асабліва ў выходныя дні, спрыяе няспешнае роздумнае чытанне. Найперш мастацкай літаратуры. Нашага разліву, як кажуць, беларускай, сучаснай. То — чарговы «Дзеяслоў» вам у рукі. У 102 яго нумары вас чакае сустрэча з адмысловай прозай Андрэя Федарэнкі і Валерыя Гапеева. Думаю, падасца займальным і цікавым і эсэ ў стылі нон-фікшн філосафа Валянціна Акудовіча. Гэта — найбольш вартае, як на маё меркаванне, з *салідных* публікацый часопіса. На іх адмеце шырэй і грунтоўней прыпынімся.



Пачатак рамана **Андрэя Федарэнкі** «Жэтон на метро», што публікуе часопіс, у пэўнай меры новая старонка ў творчасці вядомага пісьменніка. Ён спрабуе асэнсаваць сферу бізнесу і выкласці займальную гісторыю з дэтэктыўнай падсветкай. Вядома, расповед не столькі пра сам бізнес, як пра людзей, што ў яго ўкручаны. Ды і не толькі бізнес. Гаворка вядзецца пра двух зводных братоў з Расіі, Літавых, адзін з якіх робіць прыўладную палітычную кар'еру і ўжо стаіць адной нагой на прыступцы да самага высокага месца ва ўрадзе імперскай дзяржавы, а другі, трохі старэйшы, працуе ў вялікай лесаапрацоўчай кампаніі, маючы там свае немалыя акцыі. Малодшы кіруе старэйшым, бо нешта ў маладосці такое здарылася, што ад таго ўчынку (магчыма, крымінальнага) залежыць службовы і жыццёвы лёс іх абодвух. Таму Леаніда Літава пераводзяць (вядома, з падачы брата) з аднаго месца на другое (Латвія, Украіна, Эстонія, Польшча). Не больш двух гадоў працы, і — змена месца дыслакацыі. Цяпер ён ужо два гады ў Беларусі, якая яму вельмі палюбілася, прыжыўся тут з сям'ёй і нават сабраўся вывучыць беларускую мову (мы ж ведаем, руская — *ветлівыя людзі*). Да таго ж пачаў пісаць гістарычную прозу. Жыве і паводзіць ён сябе вельмі дзіўна, а часам і падазрона. (Sic! — пабудаваў у падворку бункер, называючы яго працоўным кабінетам.) Упарта шукаў знаёмства з беларускамоўнымі, каб хтосьці з іх дапамог з літаратурнай апрацоўкай тэкстаў. І знайшоў пенсіянера, былога выкладчыка ўніверсітэта, а той звёў Літава з паэтам Ракам, які некалі вучыўся ў таго самага выкладчыка, прафесара Самусенкава. Абодва беларусы знаходзяцца ў творчым і псіхалагічным крызісе. Адзінота і замкнёнасць змушаюць іх да знаёмства і стасункаў з Літавым... Чым далей, тым болей гісторыя заблытваецца, заводзіць герояў у непралазную палескую пушчу... А між тым, таемнасць аўтарскай задумы аніяк не выдаецца, і гэта яшчэ больш напружвае... Тут і жанчыны, і грамадска-палітычная падаплёка, і літаратура, і маральныя зрушэнні... Стыль пісьма, мова, вобразы і характары герояў Федарэнкі так дасціпна і нязмушана кладуцца на душу чытача, што ён, забыўшыся, рухаецца за сюжэтам, міжвольна ўжываючыся ў яго і суперажываючы ўсяму, што там адбываецца...

Чытвом пазначыў жанр свайго прыгодніцкага тэксту «І хай ніхто не пойдзе пакрыўджаны, або Грак і Монца Хрысцік» адметны і сталы празаік з Івацэвічаў **Валеры Гапееў**. Сюжэт раскручваецца па волі аўтара вельмі заманліва для чытача. Але, у адрозненне ад Федарэнкі, тут рука вопытнага складальніка *пазлаў* праглядаецца амаль візуальна. Ход гісторыі, якую распавядае нам аўтар, хоць асаблівай навізной і не вылучаецца, у функцыянальных дэталях і мастацкім афармленні мае свае падтэкставыя ізюмінкі. Чытанне даецца лёгка, ды і змест і яго высновы даволі ясна праглядваюцца. Зрэшты, насамрэч не ўсё так проста. Калі коратка, то фрагмент чытва, які падаецца ў часопісе як інтрыга для ўсяго будучага тэксту, можна выкласці ў пяці сказах. Хлопцы з правінцыі заканчваюць вучобу ў магістратуры ўніверсітэта. Адзін — таленавіты тэарэтык, другі прагматычны і амбітны практык. Працуюць над адным перспектыўным вынаходніцтвам і хочуць давесці яго да канца. Але месца ў аспірантуры ёсць толькі для аднаго, і яно выпадае Монцу (Мацвею). Даніла затойвае глыбокую крыўду на свайго калегу. Інтэрнацкія сябры, адчуўшы крыўду і роспач Данілы, наважваюць яго на подласць: падкласці ў рэчавы тайнік Монці бэнээфаўскія ўлёткі і распавесці пра тое людзям з органаў... Монцу «разаблачаюць» і выстаўляюць з універсітэта як апазіцыянера (хоць той ні сном, ні духам...). Ён едзе ў свой райцэнтр да хваравітай і адзінокай маці, а не знайшоўшы там працы, патрапляе ў гурт гастарбайтэраў, што адпраўляюцца на заробкі ў Расію. Аднак працадаўцы аказваюцца крымінальнікамі і завозяць хлопцаў у Чэчню, прадаючы іх горцам у рабства... Монца апынаецца ў безвыходнай сітуацыі, але ў яго ачахлы дух усяляе надзею такі ж, палонены перад ім, рускі афіцэр па прозвішчы Грак, якога Монця заспявае пры смерці і выходжвае... Словам, каб выйсці за межы ўласнага гора, абодвум даводзіцца натуральна прабівацца самыя што ні ёсць горы...

« — Я тут усё аблазіў. У левы бок нам дарогі няма, наверх — няма, управа — вось апошні крок. Такім чынам, скалу скінем у прорву — зможам перайсці.<...> Гэта табе не твае беларускія лясы, дзе можна і грыба з'есці, і жабку. Тут камяні грызці не станеш. Заблукаць у гарах — лягчэй лёгкага, бо тут усё падманнае. І адлегласці, і велічыні. <...> У нас няма іншага паратунку, як самім шукаць выйсця. Іначай апынемся ў нейкі дзень на дне прорвы. <...>

Сек Грак, затым — Мацвей, потым зносілі і выкідалі аскалёпкі ў прорву, і зноў секлі. Скала паддавалася — з адным узмахам аддавала кавалачак на два-тры сантыметры са свайго нутра».

Тэкст займальны — яго сюжэтная ніць, як провад з пераменным токам, штораз напружвае і падвышае цікавасць да чытання. Сіла волі, гонар і маральнасць падчас вялікіх выпрабаванняў чалавечага цела і духу. Што праўда, чытача чакае незадача: калі раман Федарэнкі будзе ў часопісе дадрукаваны цалкам, то больш чым на публікацыю фрагмента з чытва Гапеева часопіс не разлічвае. Прыхільнікам давядзецца чакаць кніжкі.

З малой прозы публікуюцца апавяданні **Алены Брава** («Карыятыда ў маціцовых кліпсах»), **Сяргея Рублеўскага** («Хлюст наезны») і дэбютанткі **Дар'і Значонак** («У ноч на сямнаццатага ліпеня»).

Спадзяюся, што шмат каго зацікавіць і гісторыя элітарнага часопіса «Крыніца», выкладзеная ў асабістай інтэрпрэтацыі і з уласнага пункту гледжання вядомым і папулярным філосафам **Валянцінам Акудовічам**, але як па мне, дык даволі аб'ектыўна, хоць і занадта сцісла праз спрошчанасць і не дарэшты асветленную запавуціненую частку некаторых вострых і цямнейшых вуглоў у існаванні гэтага знакавага мастацка-літаратурнага і культаралагічнага выдання 1990-х гадоў.

«Не было нічога дзіўнага, што як мы згуртаваліся ў «Крыніцы», дык загалоўнай творчай фігурай тут мне бачыўся не галоўны рэдактар Някляеў, а Разанаў. Якім жа было маё здзіўленне, калі неўзабаве высветлілася, што суладна са мной маркуе не шмат хто. Ды, відаць, і сам Разанаў не быў пэўны ў сваім вяршынстве. <...> А значна пазней нечакана ўзважылася: «Цалкам верагодна, што Разанаў і Някляеў аднолькава таленавітыя. Проста ў іх розныя мэтавыя аўдыторыі. Разанаў — паэт для багоў, Някляеў — дзеля жывых людзей». Можа яно і насамрэч так, толькі чаму аднойчы раптам падумалася ні з чаго: ***прачнуцца праз тысячу гадоў і пачытаць Разанава...***»

Напомню, што гэта працяг тэкстаў, якія Акудовіч друкуе ў часопісе са сваёй будучай кніжкі «Трэба ўявіць Сізіфа шчаслівым (Хроніка беларускага інтэлектуала)».

Што да краснага пісьменства гэтага нумара, то паэзія ў пераважнай большасці прадстаўлена вершамі. Выглядае, што **Уладзімір Арлоў** не задаволіцца адным зборнікам баладаў («Паручнік Пятровіч і прапаршчык Здань»). І трэба зазначыць, што яго новы твор «Цвіў скрыпень» ад упомненых розніцца больш каларытнай і душэўнай лірыкай, не зважаючы на метафарычную аўтабіяграфічнасць зместу. Аўтар піша пра ўласныя дзяцінства і маладосць, адшукваючы ў тым матыльковым часе абрысы, характар і мужчынскія праявы свайго бацькі — генна-гістарычную радаслоўную.

ты не дачакаўся
маёй першай кнігі
магчыма ты прачытаў яе
як і ўсе наступныя
досыць было б кнігі баладаў
Паручнік Пятровіч
і прапаршчык Здань
цябе магла прывабіць назва
ты быў лейтэнантам
памятаеш?
у тое лета
я прасіў цябе
калі пасля
будзе працяг
дай мне ведаць
напрыклад
затэлефануй
на дзень нараджэння

Аб'ёмная нізка вершаў **Васіля Жуковіча** (да яго пашанотнага юбілею — віншуем!) — гэта факталагічныя будні праміналага часу, зарыфмаваныя з сённяшняй айчыннай рэчаіснасцю і зрытмізаваныя з ходам нашай гісторыі і лёсам самога паэта ў прыватнасці.

Малая радзіма?..
Правал паміж слоў,
Хоць нехта у сэнс іх паверыў,
Назваў недарэчна святыню
малой,
Аднёс яе ў шэраг памераў.
Радзіма... У ёй да сканчэння вякоў
Прастора душу набывае.
Магчыма, бывае малая любоў,
Святыні малой не бывае.

Паэзія нешматслоўная ў сваёй духоўнай спрадвечнай моўкнасці. Гэткага вершатворчага канону стараецца прытрымлівацца паэт **Віктар Ярац**.

Лужуць фасолю бабулі
ў вянках сівізны.
Згадкі — не дзікія пчолы, не восы,
а востра так джаляць...

Хмельна-іранічныя, правакацыйна-жывыя, лёгкаслоўныя вершы **Андрэя Хадановіча** ўсё яшчэ бягуць прыпознена вясёлай кампаніяй, напамінаючы пра сябе, за сваім выдадзеным фарматам («зборнік «Школа травы», 2019). Вартае сучаснае мастацкае выяўленне свету праз прызму ўласных думак і адчуванняў.

ці помніш філфак і першыя
перакуры
паэзію бруднай красы, дацэнтаў
нянавісць і жах
як помнікі несусветнай
літаратуры
у рытм не траплялі, але цяклі
па вушах

Напевы, шэпты, замовы і літанні зболенай душы — у стоена-таямнічых паэтычных радках **Антаніны Хатэнкі**.

Схамянуся ў паўсонным зіхценні,
чужаніца й шчымлівая свая:
сумны Нехта, заблуджаны
ў ценях, –
гэта я? Гэта — я? Гэта — я.

Безумоўна, да гэтага шэрагу, як своеасаблівыя ўзоры высокага мастацкага слова, адносяцца санеты «Марафон» нямецкага паэта **Георга Гайма** (пераклад Ганны Янкута), дзе гістарычны міф праецыруецца на спрадвечную братазабойчую светабудову, і перастворанае са старабеларускай Алесем Разанавым *казанне на пахаванні Зоф'і, княгіні Чартарыйскай* багаслова **Лаўрэнція Зізанія** (?–1634) пад назвай «Як рыба хвастом надае свайму целу рух», дзе Разанаў сваім талентам пераніцоўвае рэлігійна-духоўныя пастулаты ў экзістэнцыйныя сэнсы і надае багаслоўнасці Зізанія сучасную філасофскую ўзвышанасць.

У публіцыстычна-крытычнай частцы часопіса чытач можа пазнаёміцца з шэрагам гістарычных і актуальных тэкстаў. Магчыма, найбольш прыцягальным і вартым увагі можна назваць артыкул **Юрася Пацюпы** «Яшчэ адна ананімная паэма» з адсылам да архіўных крыніц, што тычацца беларускамоўнага краснага пісьменства XIX стагоддзя. Чытачу прапануецца расшыфраваны В. Мартысюком вершаваны тэкст пакуль пэўна невядомага аўтара «Чортава сіла».

Да юбілею знанага паэта Анатоля Сыса рэдакцыя выдрукоўвае адшуканае ў спадчыне **Алеся Ліпая** (таксама заўчасна адышоўшага творцы) яго даўняе інтэрв'ю з тады яшчэ маладым «братам Максіма Багдановіча»...

Арыгінальны, дасведны, сцісла-афарыстычны і па-майстэрску выстыляваны расповед **Адама Глобуса** пра сусветна вядомага мастака Пабла Пікаса варты шырокай чытацкай увагі.

Літаратуразнаўца **Алесь Пяткевіч** разважае над кнігай «Як укладалі "Спадчыну"», што летась пабачыла свет у «Бібліятэцы Бацькаўшчыны» (укладанне Н. Гардзіенка і Л. Юрэвіча). Выданне прыўрочана да 135-годдзя ад нараджэння і 75-годдзя смерці Янкі Купалы.

Зіна Гімпелевіч рэцэнзуе зборнік вершаў Ю. Шамецькі «Непрадказальнае», а **Леанід Галубовіч** — трохтомнік выбраных твораў У. Мароза.

Напрыканцы вас чакае кніжны навігатар «Дзеяпіс».

Чытайма. Пакуль хмурэе да першага снегу...

ЛеГал

Дом Стывена Кінга — архіў і рэзідэнцыя

Сям'я Стывена Кінга вырашыла ператварыць свой дом у Бангоры амерыканскага штата Мэн у архіў і рэзідэнцыю для пісьменнікаў, аб чым першым паведаміў часопіс «Rolling Stone».

Цяпер пастаянныя чытачы атрымаюць магчымасць «патусавацца» ў асабняку Стывена Кінга, хоць, хутчэй за ўсё, там не будзе самога «караля жахаў».

Наведванне будзе ажыццяўляцца па папярэднім запісе, а пражываць у доме змогуць да пяці аўтараў, якія хацелі б папрацаваць у адзіноце. Па словах адваката Кінга, у апошнія гады сям'я пісьменніка праводзіць большую частку свайго часу ў дарозе, у Фларыдзе ці ў акрузе Оксфард, (штат Мэн).

Сям'я Кінга выдатна ставілася да горада Бангор і на працягу доўгага часу ахвяроўвала мільёны даляраў на розныя гуманітарныя мэты. Рэзідэнцыя Кінгаў на 47 West Broadway даўно стала турыстычнай славутасцю. Прыхільнікі часта фатаграфуюцца перад крывава-чырвоным асабняком пісьменніка з дэкаратыўнымі варотамі, на якіх выкаваныя разнастайныя крылатыя істоты…

Галоўныя англамоўныя раманы

Журы Букераўскай прэміі (як нядаўна і Нобелеўскі камітэт) сёлета абвесціла адразу двух лаўрэатаў. Такім чынам журы выступіла супраць правіла «толькі адзін пераможца».





Прызы атрымалі Маргарэт Этвуд за кнігу «Запаветы» («The Testaments») і Бернардын Эварыста за кнігу «Дзяўчына, жанчына, астатнія» («Girl, Woman, Other»).

Бернардын Эварыста — англа-нігерыйская аўтарка сямі кніг прозы і паэзіі, якія вывучаюць аспекты афрыканскай дыяспары: мінулае, сучаснае, рэальнае, уяўнае. Раман «Дзяўчына, жанчына, астатнія» расказвае «пра сучасную Брытанію і жаночае жыццё. Гэта жорсткі раман пра жыццё чорных брытанскіх сем'яў, іх барацьбу, боль, смех, тугу і любоў. З «асляпляльным» рытмам Эварыста вядзе нас у падарожжа міжгенерацыйных гісторый, рухаючыся па розных прасторах і спадчыне: афрыканскай, карыбскай, еўрапейскай. Яе дванаццаць галоўных герояў «выконваюць максімумы і мінімумы» нашага грамадскага жыцця. Яны мастакі, банкіры, настаўнікі, прыбіральшчыцы, хатнія гаспадыні і знаходзяцца на розных этапах жаночага веку: ад падлеткавага ўзросту да старасці. Яе стыль гарачы, востры, напоўнены энергіяй і гумарам. Мова «ахінае» чытача непаўторнай сілай, вуснымі традыцыямі і паэзіяй.

Бернардын Эварыста першая цемнаскурая жанчына, якая выйграла Букер.

Маргарэт Этвуд — пісьменніца, крытык, даследчыца літаратуры. У 2000 годзе яна ўжо атрымлівала Букераўскую прэмію за раман «Сляпы забойца». Твор «Запаветы», на думку журы, «дзікі і прыгожы раман, які сёння з намі размаўляе пераканаўча і моцна. Планка, усталяваная Этвуд, незвычайна высокая».

Букераўская прэмія (The Booker Prize) — прэстыжная ўзнагарода ў галіне літаратуры, якая выдаецца з 1969 года. З 2014-га прэмія прысуджаецца за лепшы англамоўны раман незалежна ад грамадзянства аўтара. У 2005 годзе быў заснаваны Інтэрнацыянальны букер (The International Booker), які атрымлівае аўтар, твор якога перакладзены на ангельскую мову.

Раней лаўрэатамі прэміі станавіліся Джэром Дэвід Сэлінджэр, Кадзуа Ісігура, Майкл Андатжэ ды інш.

Нямецкая кніжная прэмія

У Франкфурце-на-Майне ўручылі Deutscher Buchpreis 2019, Нямецкую літаратурную прэмію за 2019 год, нямецка-баснійскаму пісьменніку Сашу Станішычу за яго эксперыментальны раман «Herkunft» («Паходжанне»).

Чаму кніга эксперыментальная? Таму што раман інтэрактыўны і ў другой яго частцы чытач сумесна з аўтарам сам можа вырашыць, да якога фіналу твора прыйсці, выбіраючы ў канцы раздзела свае варыянты адказу з пераходам да наступнага сюжэта.

Прэмію ўручылі ў троннай зале Рэмера — старадаўняй ратушы Франкфурта-на-Майне. На думку журы, у сваім творы аўтар «з вялікім гумарам супрацьпастаўляе байкам фальсіфікатараў свае ўласныя гісторыі», у выніку чаго «аўтапартрэт з продкамі» ператвараецца ў раман пра «Еўропу розных жыццёвых шляхоў».

Памер грашовага ўзнагароджання Deutscher Buchpreis — 25 тысяч еўра, астатнія 5 фіналістаў прэміі атрымаюць па 2,5 тысячы еўра, а гэта: Рафаэла Эдэльбаўэр (Raphaela Edelbauer), Норберт Шойер (Norbert Scheuer), Джэкі Томэ (Jackie Thomae), Міку Сафі Кюмель (Miku Sophie Kühmel), Тоніо Шахінгер (Tonio Schachinger).

Літаратурная прэмія «Angelus»



Чатырнаццаты раз прайшла цырымонія ўзнагароджання літаратурнай прэміяй Цэнтральнай Еўропы «Angelus».

Сёлета яе лаўрэатам стаў празаік і паэт з Балгарыі Георгі Гаспадзінаў. Урачыстае мерапрыемства было арганізавана ў Музычным тэатры Капітолія, а ўзнагароды ўручыў мэр Уроцлава Яцэк Сутрык.

Самае важнае адрозненне «Angelus» ад іншых літаратурных узнагарод — у тым, што яе прысуджаюць пісьменнікам з Цэнтральнай Еўропы, чыя проза была выдадзена на польскай мове. Лаўрэат атрымаў грашовы прыз у памеры 150 тысяч злотых (каля 35 тысяч еўра) і статуэтку ў выглядзе анёла.

Уршуля Гленск, адна з членаў журы «Angelus», сказала пра кнігу-пераможцу — раман «Фізіка смутку»: «Аўтар заклікае нас пераасэнсаваць міф пра Мінатаўра і дазваляе зразумець, што монстар на самай справе з'яўляецца ахвярай. У гэтай прозе рэаліі балгарскага жыцця былі настолькі наўмысна ўніверсалізаваныя, што яны могуць стаць досыць блізкімі і польскаму чытачу… Гэта раман пра спагаду. Гэта балгарскія «Сто гадоў адзіноты». Гэта выдатная літаратура».

Георгі Гаспадзінаў нарадзіўся ў 1968 годзе. Ён адзін з балгарскіх празаікаў і паэтаў, творы якога найбольш часта перакладаюцца на замежныя мовы, чые тэксты абмяркоўваюць у такіх прэстыжных выданнях, як «The New York Times» або «The New Yorker». На сваёй радзіме ён апублікаваў сем паэтычных зборнікаў і восем кніг прозы, уключаючы раман «Фізіка смутку», які на балгарскай мове быў выдадзены ў 2011 годзе.

Журы «Angelus» таксама ўзнагародзіла і аўтарку лепшага перакладу на польскую мову. Ёй стала Магдалена Пытлак, выкладчыца Інстытута славянскай філалогіі Ягелонскага ўніверсітэта.

Ордэн Кавалераў Гонару

Аўтарка «Пенелапіяды» Маргарэт Этвуд атрымала прэстыжную ўзнагароду — Ордэн Кавалераў Гонару — з рук каралевы Лізаветы II. Колішняя лаўрэатка Букераўскай прэміі была ўганараваная «за істотны ўнёсак у развіццё літаратуры».

Пасля цырымоніі ўручэння, якая адбылася ў мінулую пятніцу, Этвуд падзялілася ўражаннямі: «Калі ты бачыш, які шчыльны графік у каралевы, не зважаючы на ейны век, то гэта кожнага матывуе рухацца наперад».

Маргарэт Этвуд — пісьменніца, паэтка, крытык, даследчыца літаратуры. Двойчы лаўрэатка Букераўскай прэміі: у 2000 годзе за раман «Сляпы забойца» і сёлета за раман «Запаветы».

На беларускую мову перакладзены раман Маргарэт Этвуд «Пенелапіяда», які зрабілі Марыя Мартысевіч і Вольга Калацкая. Кніга выйшла ў выдавецтве «Логвінаў».

Прэмія імя Вячаслава Чарнавіла

Лаўрэатам украінскай прэміі імя Чарнавіла за лепшую публіцыстычную працу ў галіне журналістыкі за 2019 год стаў Андрэй Тапачэўскі за кнігу «Одним життям». Такое рашэнне прыняў Камітэт па прысуджэнні прэміі, працу якога арганізуе Дзяржкамтэлерадыё Украіны.

«У кнізе прадстаўлены публіцыстычныя творы аўтара апошніх трыццаці гадоў, разважанні пра Тараса Шаўчэнку, Міхаіла Грушэўскага, Аляксандра Даўжэнка ды іншых славутых дзеячаў гісторыі, навукі, мастацтва Украіны XIX–XXI стагоддзяў. На думку членаў Камітэта па прысуджэнні прэміі, гэта і публіцыстыка, якая з гадамі не губляе сваёй актуальнасці, спрыяе адраджэнню гістарычнай памяці і ўмацаванню нацыянальнай свядомасці ўкраінцаў», — гаворыцца ў паведамленні Камітэта па прысуджэнні прыміі.

Прэмія «Парабала»

Уручана незалежная прэмія «Парабала», заснаваная 6 гадоў таму да 80-годдзя расійскага паэта Андрэя Вазнясенскага.

Яе другі год запар уручаюць у Культурным цэнтры, што носіць імя Вазнясенскага (а сама назва прэміі была «запазычана» ў знакамітага зборніка вершаў паэта.

Узнагароду, якая заснавана Дабрачынным фондам імя Андрэя Вазнясенскага, прысуджаюць прадстаўнікам усіх творчых прафесій. Як патлумачыла старшыня Фонда і член журы прэміі Зоя Багуслаўская, прэмія не «выдаецца ні за якія іншыя заслугі, акрамя таленту».

Вылучэнне на тры асноўныя і дзве моладзевыя ўзнагароды прэміі адбываецца таемна, намінаваць на яе могуць толькі члены журы. Лаўрэатаў таксама вызначаюць у час тайнага галасавання.

У галіне літаратуры ўзнагарода ўручана піцерскаму паэту Сяргею Стратаноўскаму, а Ніна Краснова, галоўная рэдактарка літаратурнага альманаха «Эолова арфа», які выдаецца з 2009 года, атрымала асобны грант. Таксама літаратурным лаўрэатам гэтага года стаў паэт Леў Аборын — яму ўручылі «моладзевую» прэмію.

На сайце «Парабалы» адзначаецца: «Пераможцы атрымліваюць каштоўныя прызы, дыпломы і грашовыя ўзнагароды: асноўная прэмія –10 000 у.е., моладзевая — 5000 у. е., « Антыкрызісная» — 10 000 у.е.».

У падрыхтоўцы старонкі выкарыстаны матэрыялы «Deutsche Welle», novostiliteratury.ru, CNN, «Афиша Daily», telegraf.com.ua, «Россия К», PA Pool via AP.

Літаратурная Беларусь

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 354-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by